КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ" ПРЭМІЯ

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 52 (1335)
30 СНЕЖНЯ 2017 г.

Фота БелТА

Нашы дзеці

Навагодняя дабрачынная акцыя "Нашы дзеці", якая штогод праходзіць пад патранатам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, завяршылася 28 снежня святам у сталічным Палацы Рэспублікі.

На галоўную ёлку краіны запрасілі больш за дзве тысячы школьнікаў 8 — 14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі: дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дзяцей, якія выхоўваюцца ў апякунскіх сем'ях, выхаванцаў кадэцкіх вучылішчаў, дзяцей з сем'яў бежанцаў, навучэнцаў — пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, школьнікаў, якія дасягнулі поспехаў у грамадскай рабоце.

— Ведаю, вы разумныя, назіральныя і разумееце, што на Зямлі не ўсе вашы равеснікі могуць вось так прыйсці да Прэзідэнта на ёлку, пабываць на школьнай ёлцы, у бацькоў на прадпрыемствах атрымаць падарункі, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас свайго выступу ў Палацы Рэспублікі. — Ёсць шмат месцаў на нашай планеце, дзе дзеці не проста галадаюць, а паміраюць ад голаду. Я гэта гавару, каб мы з вамі аб гэтым помнілі. Калі мы гэта будзем помніць, мы будзем шанаваць і мінулае, і сучаснае, будзем ствараць лепшую будучыню. Гэта вельмі важна. Мы стараемся, каб вы не толькі ганарыліся сваёй Радзімай, але і збераглі, прымножылі тыя дасягненні, якія дастануцца вам ад цяперашніх пакаленняў. Гэта самая вялікая мая мара, і я думаю, вы абавязкова яе рэалізуеце.



Трубач Рома чакае сяброў

У сваёй майстэрні Аляксандр ШАППО захоўвае эскіз скульптуры вулічнага музыканта для Наваполацка.

Культурнай сталіцай Беларусі на 2018 год абраны Наваполацк. Гэта адзін з самых маладых гарадоў Беларусі — налета яму споўніцца ўсяго 60. Ды не зважаючы на тое, ён ужо мае ўласную гісторыю, у тым ліку і культурную. Што на яго вуліцах выклікала "Ах!", і як мастакі зрабілі гэта месца непадобным да ўсіх іншых у краіне? І што было б варта ўдасканаліць у наступным годзе, каб пачэсны "сталічны" статус запомніўся Наваполацку надоўга? Успамінамі пра горад свайго дзяцінства, а таксама думкамі пра фарміраванне яго эстэтычнага асяроддзя з "К" падзяліўся скульптар Аляксандр ШАППО.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Яго вулічны музыкант — бадай, самая вядомая скульптура ў Наваполацку. Трубач пасяліўся на плошчы Будаўнікоў дзесяць гадоў таму. І за гэты час новых бронзавых жыхароў, якія перацягнулі б на сябе ўвагу, у горадзе пакуль не з'явілася.

— Гэта марачок Рома, — распавядае скульптар. — У яго на левай руцэ ёсць татуіроўка з імем і якарам, калі прыгледзецца. Для мяне ён чалавек, які служыў на рачным флоце і ўрэшце "прыплыў". Працы на Заходняй Дзвіне больш няма, але ён узгадаў пра сваю музычную адукацыю і цяпер займаецца тым, што грае на вуліцы на трубе. У народзе вобраз неяк прыжыўся, нават у мяне часам пытаюцца: "А вы ведаеце, што яго завуць Рома?" Імя, напэўна, засела ў галаве яшчэ з тых часоў, калі быў папулярны мульцік пра боцмана і папугая Рому.

Ад народных абдымкаў скульптура ўжо блішчыць — што само па сабе сведчыць пра яе запатрабаванасць.

— Нацерлі яго там моцна — нібыта глянцавы стаў, — смяецца аўтар. — Бачна, што з ім шмат фатаграфуюцца, залазяць яму на рукі, абдымаюць, абапіраюцца на левы чаравік. Раней папяровыя банкноты ў капялюш кідалі, а цяпер да дэкаратыўных манет сыплюць сапраўдныя. Я і задумваў скульптуру як гульнёвую кантактную работу. Хацеў, каб яна была эмацыйная. Думаў, ну як жа гэта зрабіць? Хадзіў у Мінску на рэпетыцыі духавікоў, замалёўваў, як яны граюць на трубах. І зразумеў, што трэба герою шчокі надзьмуць і вочы вылупіць.

Заканчэнне — **на старонках 2 — 3.**

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Віншаванні

Паважаныя калегі! Дарагія сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з Новым 2018 годам!

Гэтымі перадсвяточнымі днямі ўсе мы прыгадваем найбольш яскравыя ўражанні ад года, з якім развітваемся. У кожнага з прафесіяналаў нашай сферы яны звязаны з удалымі канцэртамі, паспяховымі прэм'ерамі, непаўторнымі святамі, гучнымі творчымі перамогамі і здзяйсненнямі. Маю ўпэўненасць, што 2018-ы будзе асвечаны менавіта такімі падзеямі!

На канец снежня — пачатак студзеня прыпадае адзін з найбольш насычаных перыядаў вашай працы. Бо менавіта ў гэты час вы дорыце людзям святочны настрой і перадаяце цеплыню сэрцаў. І гэткім чынам робіце іх бліжэйшымі да свету прыгажосці і духоўнасці ў самых розных праявах: тэатральнае і музычнае мастацтва, кіно і аматарская творчасць, бібліятэчная справа і культурна-асветніцкая дзейнасць.

Хочацца выказаць словы шчырай падзякі за ваш унёсак у справу развіцця нацыянальнай культуры, нястомны пошук шляхоў да яе абнаўлення і развіцця, а таксама за яе прэзентацыю на высокім узроўні па-за межамі нашай краіны.

Няхай Новы год прынясе невычэрпнасць творчых поспехаў, заснаваных на таленавітых ідэях, больш натхнёных дзён і нястомнага аптымізму! Жадаю Вам моцнага здароўя, вялікага асабістага шчасця, радасці творчасці і дабрабыту!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь
Юрый БОНДАР

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — члены Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы шчыра віншуюць работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва, рэдакцыйны калектыў і ўсіх чытачоў газеты "Культура" з Новым 2018 годам і Нараджэннем Хрыстовым!

Ад усяго сэрца жадаем, каб наступны год стаў для кожнага з вас адным з лепшых гадоў жыцця, каб спраўдзіліся самыя жаданыя спадзяванні, а ваш надзённы клопат аб культурным і духоўным развіцці мільёнаў беларусаў знайшоў у іх сэрцах удзячны водгук.

Добрага вам здароўя, чалавечага шчасця, асабістых і прафесійных здабыткаў. Няхай новы год будзе багатым на культурныя падзеі, радасным і цікавым.

Ігар МАРЗАЛЮК,
старшыня камісіі

Увага! Аб'ява!*

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— дацэнт кафедры майстэрства акцёра;
— дацэнт кафедры кінатэлеаператарства;
— старшы выкладчык кафедры скульптуры;
— загадчык кафедры графікі.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас: 220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў, тэлефон — 366-93-41.

Газета КУЛЬТУРА ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года. Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.**
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
© "Культура", 2017.
Наклад 4 001. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 29.12.2017 у 14.30. Замова 4463. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Трубач Рома чакае сяброў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

"СКУЛЬПТУРА Ў ГОРАДЗЕ — ГЭТА ВАЖНА"

Рома — вобраз зборны. І не сказаць нават, што выдуманы — такі персанаж усё ж мог існаваць, бо музыканты раней былі ці не ў кожным калектыве гарадскіх прадпрыемстваў. Напрыклад, у аркестрах "Нафтана" ці "Паліміра". Але помнік паставілі амаль што выпадкова — у час святкавання 50-годдзя Наваполацка.

— Мы з бацькам (мастак Уладзімір Шаппо — **"К"**) увесь час хадзілі ў мэрыю з рознымі прапановамі: "Давайце ставіць скульптуру ў горадзе, гэта важна", — узгадвае аўтар. — Неяк я прывёз эскіз з музыкантам. Мэрам тады быў Аляксандр Камароў. Яму спадабалася: "Класная работа, давай паставім". У парку непадалёк з'явілася яшчэ работа маёй жонкі Ксеніі "Каханне на даўгіх нагах" — дзве птушкі. А за крамай "Паўлінка" — каменныя скульптуры з пленэра, які я праводзіў таксама да 50-годдзя горада.

Трубач — толькі адна з рэалізаваных на вуліцах Наваполацка задум Аляксандра Шаппо. Ідэй у скульптара было і застаецца безліч.

— Каля бібліятэкі імя Маякоўскага цікава было б зрабіць фігуру паэта — так, каб ён нібыта шпацыраваў разам з іншымі гараджанамі, — кажа мастак. — Не пафасна-манументальны, а натуральны — як частка гарадской прасторы. У нас з бацькам былі ідэі зрабіць помнікі-прысвячэнні вёскам, якія "з'еў" горад — старую з вядром, кавалак плота, на якім сядзіць кот... Я ўдзельнічаў у складзе аўтарскага калектыву ў конкурсе на помнік на плошчы Будаўнікоў, і мы нават перамаглі, але ўсё адно штосьці не пайшло. Задумак для Наваполацка каласальная колькасць!

ТРЫ ГРАЦЫІ І ЗОРКІ-ХУЛІГАНЫ

І гэта невыпадкова, бо бронзавы трубач — далёка не адзінае, што звязвае з горадам Аляксандра Шаппо.

— У мяне чатыры малыя радзімы, — тлумачыць ён. — Віцебск, дзе пазнаёміліся мае бацькі і дзе я нарадзіўся; Бабруйск, куды часова пераехаў да бабулі з дзядулем; Наваполацк, дзе прайшло маё дзяцінства; Мінск, дзе жыву і працую цяпер.

Аляксандр — старэйшы з дзяцей у мастацкай дынастыі Шаппо. Калі бацькі пераехалі ў Наваполацк у 1974 годзе, яму было тры гады. Яго браты Павел і Антон ды сястра Марыя нарадзіліся ўжо ў Наваполацку.

— Тады гэта быў малады горад, у які не толькі хімікаў і інжынераў запрашалі, але і мастакоў, каб фарміраваць паўнавартаснае асяроддзе, — кажа скульптар. — Бацьку прапанавалі выкладаць у мастацкай школе №1, мама працавала настаўніцай малодшых класаў у школе №9. Мы з братамі там таксама вучыліся і дадавалі ёй клопату сваёй актыўнасцю.

Сілу мастацтва і ўплыў гарадскога асяроддзя, у якім жывеш штодзень, Аляксандр зведаў на сабе яшчэ тады.

— У Наваполацку я хадзіў у тры школы — другую, чацвёртую і

2018 — Год культурнай спадчыны ў краінах Еўропы

На пачатку снежня ён быў афіцыйна распачаты на Еўрапейскім культурным форуме ў Мілане.

Мэта падобнай акцыі, ініцыяванай Еўрапейскай камісіяй — прасоўванне культурнай разнастайнасці, аб'яднання грамадства праз міжкультурны дыялог, а гэтаксама ўмацаванне эканамічнага ўкладу культурнай спадчыны ў творчы сектар ды развіццё рэгіёнаў.

У той жа час ініцыятыва скіравана не толькі на прыцягненне ўвагі, але і падымае праблемныя пытанні. Гаворка ідзе пра экалагічны і фізічны ціск на аб'екты культурнай спадчыны, незаконны зварот культурных каштоўнасцей, "наступ" лічбавых тэхналогій. Напрыклад, у межах Года культурнай спадчыны будуць вылучаныя культурныя аб'екты ў розных краінах Еўропы, якія знаходзяцца ў найбольшай небяспецы. Кампаніям і банкам прапануюць варыянты ўдзелу ў працэсе захавання гэтых помнікаў.

У 2018 годзе Еўрапейскі саюз запланаваў шмат мерапрыемстваў і акцый, што будуць садзейнічаць пераасэнсаванню і ахове культурнай спадчыны. Асноўную працу возьме на сябе Europa Nostra — вядучая арганізацыя ў галіне культурнай спадчыны ў ЕС.

— Беларускія арганізацыі і проста неабыякавыя людзі могуць далучыцца да Europa Nostra, — кажа Марыя Савушкіна, эксперт ад Беларусі "Культурнай абсерваторыі краін Усходняга Партнёрства". — Такое сяброўства — гэта выдатны шанец стаць часткай агульнаеўрапейскага руху ў ахове культурнай і гістарычнай спадчыны, знайсці партнёраў і аднадумцаў. Што ў сваю чаргу адкрывае магчымасці айчынным арганізацыям прыняць удзел у праграме фінансавання культурных праектаў Creative Europe.

"Культурная абсерваторыя краін Усходняга Партнёрства", якая спрабуе разгледзець культуру Беларусі і іншых краін, выкарыстоўваючы актуальныя падыходы, прынятыя ў Еўропе, была створаная пры падтрымцы Праграмы ЕС "Культура і Крэатыўнасць" і працягне сваю працу ў 2018 годзе.

Культурнай сталіцай Еўропы ў 2018 годзе стане Валета — сталіца Мальты.

К

На днях сталі вядомыя імёны пераможцаў конкурсу рэжысёрскіх эксплікацый, зладжанага Міністэрствам культуры краіны, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў і Беларускім саюзам тэатральных дзеячаў з мэтай выяўлення і падтрымкі цікавых ідэй у сцэнічным мастацтве.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

З 20 заявак, пададзеных на конкурс, права ажыццявіць спекталь па сваёй задумцы атрымалі шэсць аўтараў: Вольга Кірэева — праект "Аліса ў Залюстэраччы" Льюіса Кэрала, Дар'я Марчанка — праект "Скрыпкі часам" Франсуазы Саган, Дзмітрый Цішко — праект "Ураджай" Паўла Пражко, Алена Сілуціна — аўтарскі праект "Сабакі", Карына Рыбак — аўтарскі праект "Музыка вуліц" і Раман Падаляка — праект "Радзіва "Прудок". Дзённік А. Горвата".

З просьбай распавесці пра свае працы "К" звярнулася да двух пераможцаў — Карыны Рыбак і Рамана Падалякі.

— Мой праект заснаваны на інтэрв'ю з дзевяццю вулічнымі музыкантамі, — распавяла студэнтка БДАМ Карына Рыбак. — Гэта дакументальная п'еса, ідэя якой нарадзілася літаральна на вуліцы,

дзявятую, — згадвае ён. — Дарога да другой ішла праз цэнтральную плошчу Будаўнікоў. Тады там быў шыкоўны плакат кшталту “Слава будаўнікам камунізму”. Мне так падабаўся там партрэт мужыка, што я ўсё думаў, як бы мне гэтаксама выразна маляваць навучыцца. І яшчэ ўразіла велізарная мазаіка са смальты на сцяне. На шчасце, яна захавалася і цяпер. Каб у наш час замовіць такую, трэба мець фантастычныя фінансавыя магчымасці — смальта ж вельмі дарагая. Перад Палацам культуры нафтавікоў стаялі тры грацыі, выразаныя з дубу — шыкоўная работа Льва Аганава, які потым стаў маім настаўнікам. Памятаю, што ўсё гэта ўражвала і выклікала “Ах!” Я ішоў той дарогай у школу, каб прасякнуцца мастацтвам. Часта нават спазняўся з-за гэтага.

Па сямейнай легендзе, скульптара ў сыне бацькі ўбачылі амаль адразу пасля пераезду ў Наваполацк.

— Па словах бацькі, ляпіць я пачаў ужо гады ў чатыры. Ён убачыў, як я зрабіў нейкі паравоз, і потым заўсёды распавядаў, які класны быў той паравоз, — смяецца Аляксандр. — У дзявятай школе я быў адказным за сценгазету і маляваў там хуліганаў, а яны кралі нашы газеты, бо ім вельмі падабалася, як яны там выглядаюць — з вялікімі кулакамі, фінгаламі пад вачыма. Мяне паважалі за тое, што я рабіў іх зоркамі. Маўляў, сапраўдны мастак.

У чацвёртым класе будучы скульптар пайшоў яшчэ і ў мясцовую мастацкую школу.

— З-за гэтага давялось кінуць заняткі ў басейне, — узгадвае ён. — Я плаваў у школе алімпійскага рэзерву. І неяк на адказных спаборніцтвах задумаўся і ўрэзаўся ў борцік. Каманда засмуцілася, што я сарваў ім агульны вынік, а я — не, бо ўжо жыў іншымі захапленнямі. Бацька выкладаў гісторыю мастацтваў, у яго я таксама вучыўся ў мастацкай школе. Каб я там слабіну даў, ён бы першым мяне выгнаў, а не кагосьці іншага. Ён заўжды казаў: “Калі не цягнеш, то і не бярыся. А калі ўжо стаў на такі шлях, будзь найлепшым”. Я пайшоў тым шляхам інтуітыўна — у мяне былі дадзеныя, ляпіць і маляваць здавалася лёгкай справай. Мама падсоўвала мне адпаведную літаратуру. У нас дома была самая вялікая бібліятэка ў горадзе па выяўленчым мастацтве — дзесяць тысяч кніг.

МАСТАЦТВА НА КОЖНЫМ КРОКУ

Уладзімір Шаппо працаваў тады яшчэ і ў майстэрнях, якія раней месціліся на вуліцы Паркавай. Цяпер іх ужо там няма.

— Я рана пачаў дапамагаць бацьку, разам з ім працаваў над вітражамі і роспісамі — зарабляў так сваю першую капейчыну, — усміхаецца Аляксандр. — Акцэнт на мастацтве ў афармленні гарадской прасторы ў той час быў заўважны. Яно абавязкова прысутнічала ў паліклініках, басейнах, школах — самых розных будынках. Захавалася не ўсё, але тое, што засталося, — унікальныя рэчы. Не дзіва, што ў 1980-я гады менавіта ў Наваполацку адбылося такое вялікае мерапрыемства, як З’езд мастакоў-манументалістаў СССР. Мне здаецца, гэта адзіны ў Беларусі горад, дзе нават пад’езды дамоў і прыпынкі грамадскага транспарту афармленыя рознымі мазаікамі. Сёння нават уявіць складана, каб хтосьці замовіў нешта такое і вылучыў на гэта сродкі.

Скончыўшы мастацкую школу, Аляксандр у 1986 годзе паступіў у Рэспубліканскую школу мастацтва і музыкі імя Івана Ахрэмчыка. Пасля арміі канчаткова пераехаў у сталіцу і паступіў у Акадэмію мастацтваў. Потым паступова ў Мінск перабралася ўся сям’я Шаппо. Але пра Наваполацк у ёй засталіся цёплыя ўспаміны.

— Столькі звязана з гэтым горадам! Спачатку ён падаваўся мне велізарным. Ідзеш па ім — быццам на край свету. Хаця потым я зразумеў, які ён невялікі. Мама бацьку ў майстэрню суп перадасць. Я мог праз увесь горад прайсці, а суп не астываў, — смяецца Аляксандр Шаппо. — Столькі месцаў цікавых там было — цір і могілкі каля мастацкай школы, лазня, нават ваенкамат. Я заспеў яшчэ тыя часы, калі на святы кінамеханікі вывешвалі ў дварах экран і паказвалі па вечарах фільмы проста на вуліцы. Мяне як старэйшага сына мама пускала на такія паказы. Калі адкрыўся кінатэатр “Мінск”, трэба было ў чарзе стаяць, каб узяць білет на заўтрашні дзень. Наваполацк нават лічыўся круцейшым за старажытны Полацк. Цяпер такога няма. Як і паўсюль, усё больш гандлёва-забаўляльныя цэнтры з’яўляюцца. Ад гэтага мне крышачку сумна. А можна было б сфарміраваць ледзь не цэлую вуліцу скульптуры — і камернай пленэрнай, і бронзавай.

К

Даведка

Наданне статусу культурнай сталіцы — штогадовая рэспубліканская акцыя для падтрымкі і развіцця культуры ў рэгіёнах Беларусі. З 2009 года гэта званне атрымліваюць розныя гарады. Яго ўжо мелі: Віцебск, Полацк, Гомель, Нясвіж, Магілёў, Гродна, Брэст, Маладзечна. Цягам 2018 года дзеячы культуры з усёй краіны наведаюць Наваполацк, які будзе святкаваць 60-годдзе.

Радзіва сцэнічнае

калі я сама паспрабавала сябе ў ролі вольнага музыкі.

Карына мае адпаведную адукацыю па класе гітары і ўдарных, ёй было цікава атрымаць новы досвед — паіграць на вуліцы. Калі знаёмства з адным з музыкантаў вылілася ў вялікую змястоўную размову, дзяўчына зразумела, што эксперымент мусіць перарасці ў сапраўдны праект.

— Мае рэспандэнты аказаліся вельмі цікавымі асобамі, — дзеліцца яна. — Усе розныя, але радасць жывой ігры і ўзаемадзеяння з публікай для іх, сапраўды, самы лепшы шлях самарэалізацыі.

У спектаклі будуць задзейнічаны артысты Тэатра-студыі кінаакцёра і студэнты БДАМ. Яго прэм’ера запланавана ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў у сакавіку 2018-га. Пастаноўка не абыдзецца без музыкі, як абяцае Карына Рыбак — падчас спектакля акцёры, як і належыць сапраўдным музыкам, ужываю сыграюць тыя мелодыі, што гучаць на вуліцах Мінска.

Не менш цікавасці выклікае і праект вядомага акцёра Купалаўскага тэатра Рамана Падалякі. Для сцэнічнага ўвасаблення ён узяў твор яшчэ аднаго слыннага “купалаўца” — Андруся Горвата, былога тэатральнага дворніка, які адным днём з’ехаў на Палессе ў вёску Прудок і напісаў пра тамтэйшае жыццё кнігу, скарыўшую сэрцы беларусаў. Гаворка — пра нашумелы зборнік “Радзіва “Прудок”.

— Асабіста для мяне твор Андруся стаў адкрыццём, — распавядае гісторыю нараджэння свайго праекта Раман Падаляка. — Таму ідэя зрабіць з яго тэатральны праект падалася цалкам натуральнай. Таксама ў нашым выпадку гэта і жаданне пашырыць аўдыторыю апавядання — каб з ім пазнаёміліся яшчэ больш людзей.

Сцэнічную адаптацыю акцёр робіць са сваім калегам “па цэху” — артыстам Міхаілам Зуем.

— Сваю ролю як рэжысёра пастаноўкі я ўспрымаю даволі ўмоўна, — кажа Раман. — Гэта будзе сумесная праца з акцёрамі, працэс нараджэння спектакля разам. І хачу падкрэсліць, што мы хочам прапанаваць свой погляд, алюзію на выказванне аўтара, не рабіць літаральнае прачытанне яго твора.

Прэм’ера пастаноўкі “Радзіва Прудок. Дзённік А. Горвата” мусіць адбыцца на Камернай сцэне Купалаўскага тэатра ў красавіку. Спрыяе яе ажыццяўленню і мастацкі кіраўнік установы — Мікалай Пінігін.



Андрусь Горват на сцэне Купалаўскага тэатра.

— Ён адразу вельмі цёпла паставіўся да матэрыялу, і толькі садзейнічае нашаму праекту, — распавядае Раман Падаляка.

— Трошкі пашыраючы кантэкст, праект, натхнёны творам Андруся Горвата, уключае ў сябе тры часткі, — адзначае акцёр. — Кінастужка (акурат зараз Раман заканчвае манціраваць невялікі дзевяціхвілінны эпізод, які мусіць прыняць удзел у фестывалі velcom smartfilm — **Д.А.**), уласна спектакль і паказ пастаноўкі ў Прудку, дзе і нарадзіўся сам літаратурны твор. Гэта ў ідэале, — кажа акцёр.

Як адзначаецца ў палажэнні аб конкурсе, фінансаванне пастановак пераможцаў будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а гэтаксама за кошт іншых крыніцаў, якія не супярэчаць заканадаўству Беларусі.

К

Калонка рэдактара

Рэальны плён віртуальнай актыўнасці

За амаль прамінулы год у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны не адбылося нічога асабліва важнага. Напэўна, нехта адзначыць, што гэта дрэнна само па сабе — і будзе мець рацыю. Аднак, як падаецца, у сёлетніх тэндэнцыях і падзеях можна знайсці нагоды для аптымізму. Галоўная з іх — прыкметны рост грамадскай актыўнасці.

Ілья СВІРЫН

Пакуль гэтая актыўнасць мае збольшага віртуальны характар і разгортваецца найперш у інфармацыйнай прасторы. Маштабу, які дазваляе “ўзяць ды зрабіць”, нашы грамадскія ініцыятывы яшчэ не дасягнулі — за адзінкавымі выключэннямі кшталту рэстаўрацыі Любчанскага замка і аднаўлення маёнтка ў Наднёмане. Але нават віртуальная дзейнасць прыносіць рэальныя вынікі: да “голасу грамадскасці” чым далей тым болей прыслухоўваюцца. Той жа прыклад Асмалоўкі пераканаўча сведчыць, што купка неабыякавых, актыўных і дасведчаных асобаў можа ўносіць карэктывы нават у горадабудаўнічыя планы. Лёс атмасфернага раёнчыка Мінска пакуль дэ-юрэ не вырашаны, але паколькі аргументы ахвотных яго знесці становяцца ўсё больш няўпэўненымі, можна меркаваць, што Асмалоўка ўсё ж застанецца.

Іншы прыклад, пра які мы ўжо не раз пісалі — дзейнасць Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана, якая ўсімі магчымымі сродкамі піярыць не толькі саму гэтую постаць, але і былое котлішча роду ў Грушаўцы — між іншым, у поўным паразуменні з мясцовымі ўладамі Ляхавіцкага раёна. Цяжка сказаць, як і наколькі гэтая медыя-“шуміха” паўплывала на вынік, але… галоўнае, што ён ёсць. Выйграны сёлета райвыканкамам грант Еўрасаюза адкрывае перад занядбанай сядзібай рэальныя перспектывы.

Між тым, перспектыва многіх іншых закінутых помнікаў пакуль несуцяшальная. Акурат “пад ялінку” СМІ ўспеніла сумная навіна — абвалілася частка мура езуіцкага касцёла ў Мсціславе. Паведаміў пра гэта, між іншым, таксама “неабыякавы грамадзянін” — выхадзец з Мсціслава Дзяніс Касцюкевіч.

На вялікі жаль, шматгадовыя заклікі адпаведнага ўпраўлення Міністэрства культуры аб правядзенні на праблемных аб’ектах спадчыны першачарговых супрацьаварыйных работ — хай сабе, гаспадарча-валанцёрскім спосабам ды з выкарыстаннем танных часовых матэрыялаў — у большасці выпадкаў былі для мясцовых уладаў што “глас вопиющего в пустыне”. Вось і ў Мсціславе, дзе за апошнія гады будавалася і рамантавалася шмат чаго (у тым ліку, і літаральна ля ўзножжа езуіцкага касцёла), рукі да яго так і не дайшлі. Як не даходзяць яны сёння і да падобных барочных руін у Селішчы, Княжыцах, Смалянах, Лыскаве… Кожны з гэтых аб’ектаў можа стаць наступным. Плюс яшчэ многія дзясяткі кінутых на волю лёсу сядзіб, цэркваў, сінагог...

А вось сякія-такія работы па кансервацыі знакамітай Белай Царквы былі праведзеныя. Калі верыць дадзеным нашай разведкі, адбылося гэта сіламі прыватных асобаў з ліку мясцовых жыхароў і без усялякага ўзгаднення. Апошняе, напэўна, ужо перагін. Энтузіясты маглі б атрымаць і афіцыйнае “блаславенне”, і сякую-такую метадалагічную дапамогу, каб яны ведалі, куды і як звяртацца. Адпаведна, у плане росту грамадскай актыўнасці паўстае і іншы аспект праблемы — неабходнасць каардынацыі.

Між тым, прыклад мсціслаўскага касцёла павінен быць для нас павучальным яшчэ і па іншай прычыне. Як вядома, на пачатку 2000-х храм сталі рэстаўраваць, але потым гэтая справа забуксавала. І аб’ектаў у такім “падвіслым” стане на Беларусі набярэцца з добры тузін.

Выраз пра добрыя намеры, якімі выбрукаваны шлях у пекла — гэта акурат пра незавершаную рэстаўрацыю. Бадай клінічны выпадак — сядзібны дом у Грозаве. Адна фірма выкупіла яго ў свой час за капейкі, пачала работы, зняўшы дах — і закінула. Цяпер свежапабеленыя калоны порціка побач з пачварнай руінінай выглядаюць на нейкі здзек. Пікантнасць сітуацыі яшчэ і ў тым, што аб’ект не мае афіцыйнага статусу помніка спадчыны. Таму калі ён раптам знікне (а ўсё пакуль да гэтага і вядзе), вінаватых не будзе.

На такім тле радуе паведамленне, што ў Пустынках і Юравічах у наступным годзе работы плануецца працягнуць. Хочацца верыць, храмы там не паўтораць лёс мсціслаўскага. Фінансаванне чакаецца і на рэалізацыю трошкі “завіслых у часе” праектаў захавання трох замкаў — Крэўскага, Гальшанскага і, вядома ж, Навагрудскага. Таму, перафразуючы вядомы сярод рэстаўратараў выраз, хочацца верыць, што налета нашы руіны стануць трохі болей трывалымі.

К

Падзеі, развітанні, вяртанні...

Якім быў 2017 год у беларускай культуры? Мяркуючы па ацэнках журналістаў “К”, даволі насычаным. Можа, ён і не надта багаты на перамогі і здзяйсненні, вартыя гучных эпітэтаў, але адметных падзей у ім не бракавала. І гэта, бадай, самае важнае.

Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — 85.

ПРЫНЦЫП УЗЕМАЗЛУЧАНЫХ ЮБІЛЕЯЎ

Падзея года ў акадэмічным музычным мастацтве — два юбілеі нашых вядучых устаноў у гэтай галіне: Акадэміі музыкі і Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Паміж сабою яны ўзаемазвязаныя. Першы выпуск колішняй кансерваторыі заклаў падмурак канцэртнай арганізацыі. Розніца ў пяць гадоў з часам знівеліравалася, як гэта бывае і з людзьмі. Сёння дзве ўстановы — раўнапраўныя партнёры. Іх моц — у шчыльным супрацоўніцтве.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Мінулі тыя часы, калі падзеямі станавіліся адно гастрольныя прыезды знаных музыкантаў. Сёння ўсё акурат наадварот. Не, знакамітасці да нас прыязджаюць — магчыма, хіба крыху радзей, чым раней, калі такія канцэрты фінансаваліся з усесаюзнага бюджэту. Але не меншымі паводле розгаласу падзеямі становяцца выступленні найлепшых беларускіх музыкантаў. Больш шырока пачынае гучаць сучасная беларуская музыка, праходзячы прыдзірлівы прафесійны адбор. Так што куды ні зірні — скрозь выпускнікі (а часам яшчэ і пакуль студэнты) Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, якія выступаюць на роўных разам з замежнымі знакамітасцямі.

Пералічу хаця б некалькі філарманічных канцэртаў. Гэта юбілей Музычнай капэлы “Санорус” на чале з Аляксандрам Хумалой, дзе ўпершыню прагучала Канцэртная сімфонія “Вецер ахінуў лес” для сольнага фартэпіяна, хору, аргана, аркестра Вольгі Падгайскай; адкрыццё сезона ў Дзяржаўным камерным аркестры Беларусі, калі адбылася сусветная прэм’ера Містэрыі для народнага голасу, струнных, ударных і фартэпіяна “Кросны Макошы” Канстанціна Яськова, абранага кампазітарам-рэзідэнтам гэтага калектыву; вечарына польскага кампазітара-класіка Кшыштафа Пендэрэцкага ў межах XII Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета; тэатралізаванае выкананне Харавой сімфоніі-дзеяння “Перазвоны” Валерыя Гаўрыліна, здзейсненае вакальна-харавым факультэтам БДАМ. Спіс можна працягваць!

Дый такі буйны расійскі тэлепраект, як “Вялікая опера”, стаўся сёлета магутным акордам у гонар беларускіх спевакоў. У гэтым конкурсным шоу і раней у розныя гады ўдзельнічалі нашы, становячыся фіналістамі: салісты беларускай оперы Ілья Сільчукоў, Юрый Гарадзецкі. Сёлета нашых удзельнікаў двое: Уладзімір Дзмітрук, які ў гады навучання ў Маладзечанскім музычным каледжы імя М.К. Агінскага быў зоркай тамтэйшага Маладзёжнага музычнага народнага тэатра, а цяпер спявае па ўсім свеце, і Маргарыта Ляўчук — стажор нашага Вялікага тэатра. І абодва дайшлі да канца, склаўшы акурат палову фіналістаў. Чым не перамога?

Арцём Лук’яненка і Ксенія Жук на “Еўрабачанні” ў Кіеве.

З NAVI ГОДАМ!

Хай не пакрыўдзяцца на мяне прадстаўнікі разнастайных альтэрнатыўных музычных плыняў, пра якія мне давялося пісаць у 2017-м, але мінулы год прайшоў, на мой погляд, пад знакам менавіта поп-калектыва. І імя яму — NaviBand.

Алег КЛІМАЎ

Нават тыя, хто не адрозніваe ноту “до” ад ноты “фа”, цяпер наўрад ці зблытаюць галасы ўдзельнікаў гурта Ксеніі Жук і Арцёма Лук’яненкі з вакалам іншых выканаўцаў. Імклівы рывок да вяршыняў айчыннага шоу-бізнесу абумоўлены і якасным песенным матэрыялам, і той чалавечай натуральнасцю, якой валодаюць фронтвуман і фронтмэн ансамбля. Упэўнены, што з сотняў і сотняў вачэй такі хлынулі слёзы замілавання, калі гэтая пара дазволіла сабе пацалунак у фінале свайго выступу на “Еўрабачанні”. Няштучнасць у праяве самых розных пачуццяў, характэрная для творчасці гэтага гурта, знайшла масавы водгук у слухачоў што выявілася ў бясконцых канцэртах NaviBand і ў роднай краіне, і за мяжой. Ну а як людзі сучасныя, з той жа самай шчырай прастатой яны і манетызавалі ўласныя таленты, напрыклад, у рэкламнай кампаніі аднаго з сусветных брэндаў. Здавалася б, іх хапіла ў гэтым сезоне на ўсё, акрамя аднаго: не выканаў дадзенае “К” абяцанне Арцём, не звазіў ён нашага карэспандэнта ў свой родны горад Глыбокае. Затое пад заслону года калектыў выпусціў нядрэнны альбом, а сямейны тандэм абвясціў, што чакае нараджэння дзіцяці. Ура!

У сувязі жа са згаданым “Еўрабачаннем” я адзначыў для сябе такую “тэндэнцыю”, якая мела месца ў 2017-м: у Год навукі мы навучыліся не ладзіць гвалт на ўсю Сінявокую з нагоды няўдачы нашых артыстаў на тым ці іншым буйным альбо не гэтак выбітным, але міжнародным музычным форуме. Не авалодалі Гран-пры на “Славянскім базары ў Віцебску” — лянiва пабурчэлі пару дзён на магчымую кан’юнктуру. На “Новай хвалі” нікога не было заяўлена з беларускіх канкурсантаў. Не заняла Хелена Мерааі першае месца на дзіцячым “Еўрабачанні” — з кім не бывае. Не выйгралі “Новую фабрыку зорак” — ну і добра.

Аднак аб вікторыях усё ж такі марыцца. Спадзяюся, што, адкукарэкаўшы сваё, мінулы год перадае эстафету наступнаму на яго фінішнай трыумфальнай прамой! Вельмі хацелася б пачуць у 2018-м радасны брэх сабакі ў гонар нашага пераможнага музычнага каравана!

ЛЯЛЬКІ ПАКУЛЬ НАПЕРАДЗЕ

У тэатральным мастацтве цягам года было шмат выбітных падзей, звязаных з ростам айчыннага майстэрства. Сапраўднымі падзеямі станавіліся некаторыя прэм’еры — найперш, у тэатрах лялек. І, што вельмі важна, за межамі МКАД, ператвараючы не адно сталіцу, а ўсю Беларусь у вялізную сцэнічную пляцоўку.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Згадаю “Камедыю Юдзіфі” Гродзенскага абласнога тэатра лялек, пастаўленую ў ліпені і пазней паказаную на VI Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай драматургіі ў Бабруйску. Спектакль Алега Жугжды паводле п’есы Сяргея Кавалёва стаўся вельмі прыгожай, выкшталцона элітнай “цукерачкай”, зробленай, да таго ж, з карысных складнікаў, якія самі па сабе наўрад ці выклікаюць ажыятаж сярод шырокай публікі. А ў выглядзе сінтэзу тэатра (лялек і драматычнага), кіно, жывапісу, харэаграфіі (абодва Адажыа, пастаўленыя Дзмітрыем Куракулавым, і асабліва другое з іх — годныя самых прэстыжных балетных сцэн свету) — маленькі шэдэўр, дый толькі. Прычым маленькі — у сэнсе кампактны, бо “запакаваны” ў гадзіну з невялікім.

Падзеяй сталі паказы спектакля “Сіняя-сіняя...” Магілёўскага абласнога тэатра лялек на ўсіх чатырох тэатральных фестывалях, што прайшлі за год у Беларусі: “М@rt.кантакт” у Магілёве, “Белая Вежа” ў Брэсце, TEART у Мінску, імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску. Гэты спектакль, пастаўлены Ігарам Казаковым паводле аповеда Уладзіміра Караткевіча, — сапраўдны прарыў у жанравай сферы (“высокі”, а не кірмашовы монаспектакль у тэатры лялек), у звароце да новых выяўленчых сродкаў (пясочная анімацыя), розных лялечных формаў.

Восеньская прэм’ера “Новай зямлі” ў Брэсцкім абласным тэатры лялек не паспела, на жаль, атрымаць такі шырокі фестывальны шлях. Але гэты спектакль яшчэ аднаго маладога рэжысёра Аляксандра Янушкевіча — сапраўдная сенсацыя. Упершыню вялізная вершаваная паэма Якуба Коласа атрымала не эпічнае, а трагікамічнае ўвасабленне, максімальна набліжанае да самага шырокага гледача, уключаючы звычайна “адлучаных” ад тэатра падлеткаў. Упершыню ў гэтым творы былі пастаўлены, і надзвычай тактоўна, не адно сацыяльныя ды фальклорныя акцэнты, але і рэлігійныя, пададзеныя не адасоблена, а ў жывой непарыўнай повязі біблейскіх гісторый з сялянскім жыццём.

Заўважу, што ўсе пералічаныя рэжысёры — выхаванцы, у той ці іншай ступені, Аляксея Ляляўскага, які ўзначальвае сталічны тэатр лялек. І ўсе іх перамогі — гэта яшчэ і ягоны трыумф.

Што ж да тэатра драматычнага, дык у нас ён пакуль толькі намацвае магчымыя шляхі далейшага развіцця з выхадам на замежныя магістралі, а не толькі сцяжынкі беларускіх дыяспар. У размаітым шматгалоссі драматычных спектакляў (а іх у разы больш, чым лялечных) вылучу тыя, дзе актуальнасць тэмы не застаецца аднадзённай публіцыстыкай, а закранае глыбокія мастацкія пласты. Таму да падзей прылічу папраўдзе шэдэўральную “Жанчыну мора” Генрыка Ібсэна ў рэжысёрскай версіі Саўлюса Варнаса (Магілёўскі абласны драматычны тэатр), не зусім дапрацаваны, з пэўнымі паўторамі і “прабуксоўваннем” спектакль “Сіндром Медэі” Кацярыны Аверкавай па п’есе Юліі Чарняўскай (Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі), і “Тры дні ў пекле” Паўла Пражко, перайначаныя маладым Цімафеем Ткачовым з Санкт-Пецярбурга, пастаўленыя ім як дыпломная праца і паказаныя ў час Тыдня сучаснай беларускай драматургіі “Канцэнтрацыя” (Цэнтр беларускай драматургіі).

Заўважу, што два спектаклі з трох — паводле сучасных п’ес айчынных аўтараў. Чым не трыумф ЦБД на чале з Аляксандрам Марчанкам?

ЧАС ВЯРТАННЯЎ

Шчыра радуе, што гучных падзей у беларускай тэатральнай прасторы шмат. На працягу года публіку запрашалі на традыцыйныя фестывалі, якія дарылі сустрэчы з найлепшымі пастаноўкамі сусветнай сцэны і з новай мовай тэатра, на форумы, якія з новага боку адкрывалі суайчыннікам нацыянальную драматургію і рэжысуру. Я ж хачу падкрэсліць падзеі, якія не заўсёды прыцягвалі маштабную ўвагу масмедыя, але сталі значнымі для нашага мастацтва.

Настасся ПАНКРАТАВА

2017 — год вяртання. На сцэну Вялікага тэатра Беларусі вярнуўся народны артыст СССР Валянцін Елізар'еў. На яго юбілей у наш Вялікі прыехалі вядучыя харэографы і танцоўшчыкі свету, тым самым падараваўшы публіцы магчымасць спрычыніцца да лепшых узораў сусветнага балетнага мастацтва. Спадар Елізар'еў змог ізноў папрацаваць і ў родных рэпетыцыйных класах — няхай усяго толькі над аднаўленнем спектакля, але... раптам гэта першая зачэпка на шляху новага творчага супрацоўніцтва тэатра і легендарнага балетмайстра?

Гэтым годам у Беларусь вярнуўся рэжысёр тэатра лялек Аляксандр Янушкевіч. Той самы, які патрапіўшы ў Пермскі тэатр лялек, імгненна ўзняў стандартную рэгіянальную ўстанову на прыступку найлепшых расійскіх тэатраў. І хоць Янушкевіч з гэтым калектывам усё ж такі разышліся, іх агульны спектакль "Мяне клічуць Лёк" трапіў у праграму "Дзіцячы Weekend" фестывалю "Залатая маска-2018".

Расійскія калегі прызнаюць Янушкевіча адным з самых цікавых рэжысёраў сучаснасці, яму замаўляюць пастаноўкі многія тэатры лялек краіны-суседкі. Улетку спадар Аляксандр стаў першым у гісторыі летняй тэатральнай Школы Саюза тэатральных дзеячаў Расійскай Федэрацыі запрошаным з Беларусі пастаноўшчыкам. Таму мне радасна, што такому запатрабаванаму творцу знайшлося месца на беларускай тэатральнай карце. Свой прыход на пасаду галоўнага рэжысёра Брэсцкага тэатра лялек Янушкевіч адзначыў відовішчнай прэм'ерай "Новая зямля", тым самым распачаўшы наступны адметны перыяд у гісторыі вядомага калектыву. Застаецца спадзявацца, што для больш эфектыўнай творчай рэалізацыі брэсцкім лялечнікам нарэшце прэзентуюць новы тэатральны будынак.

Таксама да мінчан вярнуўся фестываль тэатра, творчасці і чытанняў "Казачны джэм", існаванне якога трымаецца выключна на ініцыятыве і неабыякавасці арганізатараў. Адзіны ў Беларусі форум для бацькоў з дзецьмі ўзросту ад шасці месяцаў мог і не адкрыцца ў трэці раз, бо да апошняга моманту не ўдавалася вырашыць пытанне фінансавання. Летась аўтар праекта Наталля Лявонава практычна здзейсніла цуд: без магутных спонсараў, сабраўшы на краўдфандынгавай пляцоўцы ўсяго 39% ад неабходнай сумы, яна разам з бэбі-тэатрам "Бусы" і Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў змагла правесці ўнікальны фестываль. Калі людзі чагосьці прагнуць і асабістымі высілкамі дабіваюцца таго, каб зрабіць сусвет хаця б крыху радасней, — ці ж гэта не заслугоўвае павагі і прызнання?

"Новая зямля" Аляксандра Янушкевіча ў Брэсцкім тэатры лялек.

ГОД ЗДАБЫТКАЎ І СТРАТ

2017 год прайшоў для Беларусі пад знакам Скарыны. Краіна святкавала 500-годдзе ўсходнеславянскага кнігадруку. Калісьці Рыгор Барадулін назваў беларусаў "народам Кнігі", а яшчэ — "эксперыментальным народам у Бога". Калі паяднаць згаданыя тэзы, дык вынікае, што эксперыментам можна лічыць фармаванне нацыі на глебе духоўнасці, і з матэрыялістычнага гледзішча гэта падаецца неверагодным. Аднак ёсць такая нацыя! Шанаванне ў нашай краіне справы Першадрукара сведчыць на карысць гэтай думкі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Той факт, што ў юбілейны для беларускага кнігадруку год не з'явілася ў Беларусі новых помнікаў Першадрукару альбо знакавых твораў нашага пісьменства, я не лічу адмоўным. Можа, мне б і хацелася, каб манументальная Скарыніяна, да стварэння якой прычыніліся такія творцы, як Аляксей Глебаў, Валер'ян Янушкевіч, Алесь Дранец, мела годны працяг. Але наяўнасць помніка яшчэ не азначае, што гістарычная асоба стала для нацыі чыннікам тоеснасці (вунь колькі ў Беларусі панаставілі помнікаў Леніну і наменклатурным бальшавікам — і што?). Адносна ж Скарыны відавочна, што для нас ён даўно стаў увасабленнем Радзімы і Гісторыі. Ён наш крэўны. А што і так зразумела, пра тое, магчыма, няма патрэбы лішні раз гаварыць.

Таму рэспубліканская выстава "Скарыніяна", якой было проста наканавана стаць падзеяй года ў галіне выяўленчага мастацтва, стала не дэманстрацыяй новых творчых здабыткаў, але падсумаваннем існых. Атрымліваецца, што на дадзены момант нас задавальняе трактоўка вобраза Першадрукара, увасобленая ў творах класікаў беларускага выяўленчага мастацтва, а творчае пакаленне Незалежнасці сваё слова яшчэ скажа.

"Бетон" Яўгена Карняга ў РТБД.

Гаворачы пра знакавыя падзеі года, не магу абмінуць увагаю выставу нямецкіх класікаў Кэтэ Кольвіц і Эрнста Барлаха. Сёння, калі ў нашым мастацтве пераважае рэфлексія і суб'ектывізм, не лішне згадаць творцаў з выразнай сацыяльнай пазіцыяй і духоўнымі арыенцірамі. Менавіта да кагорты такіх геніяў належаць гэтыя графік і скульптар. Калісьці ў Барлаха запыталіся пра ягонае стаўленне да супрэматызму, той адказаў, што верыць у сумленнасць мастака, які засяродзіўся на геометрычных фігурах, але асабіста яму тут няма чаму суперажываць. Слушна сказана! Мяркую, не толькі мне блізкае такое разуменне творчасці.

Сёлета ўпершыню прысуджалася Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва. Яе атрымалі асобы, чый унёсак у культуру відавочны. Але падаецца, што крытэрыі пакуль выразна не акрэсленыя. Нацыянальнай прэміяй, як мне мяркуецца, мусіць адзначацца не проста таленавіты жывапіс ці скульптура, але тое, што сілкуе нацыянальную ідэю і датычыць не шчыльнага кола адмыслоўцаў, здольных ацаніць майстэрскі штрых ці мазок, а грамады ўвогуле.

Адыходзячы год — гэта не толькі здабыткі, але і страты. Сёлета пайшлі з жыцця графік Георгій Паплаўскі і жывапісец Уладзімір Кожух. Георгій Георгіевіч — прызнаны класік. Мне цяжка штосьці дадаць да характарыстыкі ягонай творчасці, зробленай іншымі. А вось Уладзіміра Кожуха я ведаў асабіста. Гэта быў сціплы геній. Яго было складана ўявіць з мікрафонам, за трыбунаю. На вернісажах ён заўжды сціпла стаяў убаку, хоць менавіта ягоныя карціны былі ўпрыгожаннем якой заўгодна экспазіцыі. Як журналіст згадваю, што праблемай было выцягнуць з яго хоць слова ў часе інтэрв'ю. Слова "піяр" ён не ведаў. Між тым, талент ягоны відавочны. Уладзімір Кожух сказаў сваёй творчасцю важкае слова пра Чарнобыльскую трагедыю, пра Афганскую вайну. У апошніх ягоных карцінах адчувалася водгулле трагічных падзей у краіне, блізкай нам геаграфічна і духоўна. І ён жа сцвердзіў у сваіх творах асаблівы тып жаночай прыгажосці.

Спадзяюся калі-небудзь наведаць мемарыяльныя музеі Георгія Паплаўскага і Уладзіміра Кожуха.

Народны артыст Беларусі і СССР Валянцін Елізар'еў.

ЗАПАВЕТЫ ЕЛІЗАР'ЕВА

У харэаграфічным мастацтве асобай гэтага года стаў, безумоўна, народны артыст Беларусі і СССР Валянцін Елізар'еў. Падзеяй года — адпаведна, яго юбілей і тыя шматлікія імпрэзы, што ладзіліся з яго нагоды. І асабліва вечарына ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, дзе Валянцін Мікалаевіч прафесарствуе. Бо менавіта тая канцэртная праграма дапамагла найбольш дакладна і паслядоўна прасачыць унёсак знанага балетмайстра не толькі ў стварэнне адметных спектакляў і мініяцюр, якія змянілі аблічча і сам статус беларускага балета, але і ў падрыхтоўку паслядоўнікаў (не блытаць з эпігонамі).

Надзея БУНЦЭВІЧ

Важнасць першай адзначанай сферы, непасрэдна звязанай з нашым Вялікім тэатрам, відавочная, здаецца, усім без выключэння. Затое вага другой (а для некаторых — ужо само яе існаванне) сталася ледзь не адкрыццём. Але ж як цікава было прасачыць, наколькі па-рознаму развіваюцца таленты маладых і ўжо сталых, прызнаных харэографаў пад уздзеяннем майстра! І колькі новых адгалінаванняў знаходзяць яго творчыя дзеці і ўнукі ва ўсім, што ён спавядаў і чаму іх вучыў. Наколькі рознымі становяцца іх самастойныя пошукі — пры тым, што ўсе выхаванцы працягваюць штосьці фундаментальна-"елізар'еўскае".

Таму падзеяй сталі не толькі ўласна паказы асобных харэаграфічных нумароў, але і само асэнсаванне пераемнасці, якая ўзвышае ўсіх, хто ў ёй задзейнічаны. У чым жа выяўляюцца тыя "запаветы" Елізар'ева, што працягваюцца ягонымі вучнямі?

Найперш — у канцэпцыйнасці і асэнсаванасці любога харэаграфічнага выказвання. Другая рыса — сувязь з музыкай, якая пры ўсёй відовішчнасці сцэнічнага дзеяння і касцюмаў не ўспрымаецца (вось дзіва!) усяго толькі "фонам". Нарэшце, трэці пункт — гэта сімфанізм мыслення, праз які часавае разгортванне харэаграфічнага палатна будуецца на паслядоўным развіцці найбольш яркіх запамінальных рухаў — сапраўдных "інтанацый" чалавечага цела. Мова ў кожнага з выхаванцаў Елізар'ева — свая. Але ва ўсіх іх выказваннях ёсць думка, якая робіць балет адным з самых інтэлектуальных і філасофскіх відаў мастацтва. Таму падзея — гэта яшчэ і асэнсаванне грамадскасцю таго, што "балет — мастацтва думкі".

А што ж тады сучасная харэаграфія і пластыка? Тут пераканаў аўтарскі спектакль "Бетон" Яўгена Карняга ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Так рознабакова і дыскусійна, ды яшчэ на мове пластыкі, але без злоўжывання пантамімай, міф пра Арфея і Эўрыдыку яшчэ не ўвасабляў ніхто.

К

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 52 / 30 СНЕЖНЯ 2017 Г.

Праз 500 гадоў

Сёлета адбыліся дзве знакавыя падзеі ў культурным і рэлігійным жыцці краіны: з друку выйшлі першыя поўныя афіцыйныя пераклады Новага Запавету Беларускай Праваслаўнай Царквы і Каталіцкага Касцёла на Беларусі. Асабліва важна, што адбылося гэта ў год, калі Беларусь і ўвесь свет адзначаюць 500-годдзе ўсходнеславянскага кнігадрукавання, якое таксама колісь распачалося з друкавання біблійных тэкстаў. Пра цяжкасці перакладчыцкай працы, карпатлівы пошук тэрміналагічных адпаведнікаў і немінучыя спрэчныя моманты "К" пагутарыла са спецыялістамі, якія адказвалі за пераклады Новага Запавету на беларускую мову.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

ПА ДЗЕСЯЦЬ ВЕРШАЎ ЗА ДЗЕНЬ

Першай прэзентавала свой афіцыйны пераклад Новага Запавету на беларускую мову Беларуская праваслаўная царква. Як адзначыў вучоны сакратар Беларускага Біблейскага таварыства, доктар філалагічных навук, прафесар Іван ЧАРОТА, праца над ім вялася ажно чвэрць стагоддзя.



Іван Чарота.

— Чаму наспела патрэба ў стварэнні вашай камісіі? Хіба ж не існавала ўжо на той момант перакладаў Свяшчэннага Пісання на беларускую?

— Яшчэ да стварэння камісіі беларусы мелі з дзясятак перакладаў Новага Запавету, а цяпер іх — 18! Такой колькасці маглі б пазайздросціць носьбіты любой мовы. Маглі б, каб згаданыя пераклады адпавядалі актуальным патрабаванням, галоўнае з якіх — прыдатнасць для выкарыстання ў багаслужэннях. Аднак па розных прычынах яны ў літургічны ўжытак увайсці не маглі. І менавіта таму напрыканцы 1980-х гадоў па ініцыятыве Патрыяршага Экзарха Беларускай Праваслаўнай Царквы мітрапаліта Філарэта пачалася падрыхтоўка новага перакладу Свяшчэннага Пісання, які б адпавядаў належным крытэрыям.

— Ці ўваходзяць у камісію прафесійныя мовазнаўцы — дыялектолагі, даследчыкі гісторыі і сучаснасці беларускай мовы?

— Ад пачатку да ўдзелу ў працы ББК заклікаліся найперш філолагі розных спецыяльнасцей, прафесійныя перакладчыкі, пісьменнікі. Першы склад Камісіі быў унушальны і колькасна — каля трох дзясяткаў прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Праўда, колькасць не забяспечвала якасці вынікаў працы — хутчэй наадварот. Калі ацэньваць ужо з дыстанцыі часу, то можна сказаць, што гэта быў своеасаблівы дыскусійны клуб: колькі галоў — столькі прапаноў, прычым безапеляцыйных, хоць і не заўсёды належным чынам прадуманых, выверaных.

— Наколькі было складана арганізаваць працу біблійнай камісіі? Вядома, што яе склад цягам 25 гадоў пастаянна змяняўся.

— Сапраўды, у камісію ўваходзілі асобы з прыстойным літаратурна-перакладчыцкім вопытам, якія лічылі за лепшае весці працу самастойна, здзяйсняць пераклад аўтарскі, а не калектыўны. Зразумела, што сваімі "творчымі знаходкамі" яны даражылі і паступацца не хацелі; таму праца — "саборная" па задуме! — пачала стопарыцца. Не дапамагалі і навукова-творчыя семінары, "круглыя сталы". Праўда, Евангелле ад Матфея было-такі перакладзена і выдадзена ў 1991 годзе. Аднак той калектыў, пра які мы пачалі гаворку, урэшце распаўся.

Адпаведна, каб рухаць справу далей, узнікла патрэба ў новым складзе Камісіі. Цяпер ужо ён уключаў дзесяць чалавек, на чале, як і раней, з уладыкам Філарэтам. Большасць з іх была з вышэйшай філалагічнай адукацыяй (трое мелі навуковыя ступені), а чацвёра — з вышэйшай філалагічнай і тэалагічнай адначасова. Непасрэдна ж рабочую групу, якая на працягу чвэрці стагоддзя працавала рэгулярна, склалі пяць чалавек.

— Якім чынам ішла праца?

— Збіраліся мы кожны чацвер у першай палове дня. Хапала сілы і цярпення перакладаць каля дзесяці вершаў за раз. Дарэчы, што да тэмпу і выніковасці працы... "Збоку" (не "зверху") нам увесь час даводзілася чуць дакоры з-за таго, што быццам працуем мы надта марудна. Але на адным з першых пасяджэнняў новага складу ББК я прааналізаваў дзейнасць аналагічнай камісіі Сербскай Праваслаўнай Царквы, адзначыўшы, што яна Новы Запавет перакладала 21 год!

— Што ўплывала на выбар таго ці іншага слова: абгрунтаваныя доказы ўдзельніка камісіі, зварот да мовы іншых аўтарскіх перакладаў Новага Запавету, зварот да грэчаскага, лацінскага ці яўрэйскага тэксту?

> *Нам увесь час даводзілася чуць дакоры з-за таго, што быццам працуем мы надта марудна. Аналагічная камісія Сербскай Праваслаўнай Царквы Новы Запавет перакладала 21 год!*



— Пераклад намі здзяйсняўся з грэчаскага арыгінала. Найбольш спрэчныя і складаныя пытанні вырашаліся з дапамогай яго падрадкоўніка, зробленага прафесійнымі біблеістамі. А як абавязковае апірышча ў сваёй працы ББК выкарыстоўвала наяўныя пераклады на розныя еўрапейскія мовы, уключаючы, натуральна, славянскія. Асобна адзначу, што мы абапіраліся і на ўсе без выключэння беларускія пераклады, выкананыя да нас. Пры гэтым прынятыя папярэднікамі рашэнні, уключаючы і аказіянальна вынайдзеныя, падлягалі грунтоўнаму аналізу і рознабаковаму асэнсаванню. Дадам яшчэ, што ваш суразмоўнік у 2000 годзе выдаў кніжку "Беларуская мова і Царква", вынесшы на шырокае абмеркаванне самыя супярэчлівыя моманты і аб'ектыўнай прыроды, і суб'ектыўнай.

— Якія найбольш спрэчныя моманты ўзнікалі падчас перакладу і як яны вырашаліся?

— Зразумела, немагчыма было абысціся без дыскусій, часам досыць гарачых, але, на шчасце, выніковых. З часам мы знаходзілі-такі рашэнні, прымальныя для ўсіх — калі не безагаворачна, то паразумеўшыся, што "на дадзены момант лепшага ніхто прапанаваць не можа". Шчыра кажу: увесь час імкнуліся ўдасканальвацца і ўдасканальваць пераклад. Адпаведна, не пераставалі выпраўляць зробленае раней. Так, у пераклад Евангелля ад Матфея, выкананы першым складам ББК, мы ўнеслі больш за 1800 правак; у пераклад Евангелля ад Марка — каля 800. А потым усё менш: у Евангелле ад ад Лукі — недзе 300, Евангелле ад Іаана — пад 100. Пры гэтым ніколі не лічылі, што наша праца даведзена да ідэальнага стану. І цяпер так не лічым. Проста мы зрабілі тое, што маглі. А хто можа лепш, няхай удасканальвае далей.

Калі ж вяртацца да пачатковай часткі вашага пытання, то нельга не адзначыць, што ўвогуле найбольшыя складанасці задае сам аб'ектыўны стан беларускай мовы з яе выразным "канфесійным двухмоўем". Што я маю на ўвазе? Няма ў свеце іншых, скажам так, статусных моў, дзе адначасова ўжываліся б цэлыя пласты лексікі, якая відавочна сведчыць пра веравызнанне іх носьбітаў: *царква — касцёл, манастыр — кляштар, літургія — імша, ангел — анёл, Благавешчанне — Звеставанне...* Пра што і сведчаць наяўныя пераклады, у якіх неймаверная колькасць варыянтаў для абазначэння адных і тых жа паняццяў. Дастаткова звярнуць увагу на тое, што ў выдадзеных беларускіх перакладах сама назва Благавесця/Дабравесця мае ажно шэсць варыянтаў: *Евангельле — Евангелле — Евангеле — Эвангеле — Эвангельле — Эванэлія.* Шматварыянтнымі з'яўляюцца таксама імёны евангелістаў (напрыклад, *Матфей — Мацфей — Мацьфей — Мацьвей — Мацей — Матауш — Матэвуш),* прарокаў, апосталаў, святых...

Я ўсведамляю рызыкоўнасць параўнання, якое хачу прывесці, аднак паколькі згадаў пра статусныя мовы, то яно павінна пераконваць: уся гэтага кшталту лексіка, замацаваная так званым Сінадальным перакладам РПЦ, выкананым у XIX стагоддзі, дагэтуль безагаворачна прымаецца рознымі канфесіямі, не выключаючы каталікоў. Чаму ж нам трэба адмаўляцца ад падобнага, калі яно спрацуе на сцвярджэнне мовы ў статусе агульнай? Думаю, што не трэба. Вось гэта ў першую чаргу, няхай сабе і падсвядома, уплывала на Камісію пры выбары таго ці іншага слова.

— У перакладзе ўжываецца шэраг стараславянізмаў: ангел, благаславіць і г.д. Між тым, у новым "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы" (2016) слова "Благавешчанне" свядома зменена на "Дабравешчанне" і "Дабравесце", ёсць і іншыя змены стараславянізмаў на беларускія адпаведнікі.

— Дзякуй за яшчэ адно істотнае пытанне. Яно носіць не выпадковы, а вельмі сімптаматычны характар, бо вымушае задумацца пра такую важную рысу нашай літаратурнай мовы, як адчужэнне ад мовы стара(царкоўна)славянскай, прычым своеасаблівае. Трэба прызнаць, што адбывалася гэта не без пэўнай устаноўкі. Мала сэнсу тут мімаходзь залазіць у гушчары палітыкі, гісторыі мовы, ды і лексікаграфіі таксама. Але нават пры розных поглядах на гістарычныя супярэчнасці мы з вамі, відаць, можам пагадзіцца як з відавочным, што якраз гэтая тэндэнцыя адбілася на змесце згаданага вамі слоўніка ўвогуле і на замене названых слоў у прыватнасці.

Уласна, да абмеркавання гэтай праблемы можна падысці з іншага боку: не толькі дапушчальна, але і зусім нармальна, што такія слоўнікі тлумачаць словы, якія ўжываюцца ў літаратуры і СМІ. А тыя словы, якія тысячагадовай моўнай практыкай замацаваны як у царкоўным, так і ў штодзённым пазацаркоўным ужытку, — гэта профіль іншых слоўнікаў. У рэшце рэшт, людзям уцаркоўленым няма патрэбы тлумачыць ці ператлумачваць ім добра вядомае, а тым больш навязваць іншыя паняцці дзеля актуалізаванай "літаратурнай нарматыўнасці" (добра, што хоць не навязваецца "нарматыўнасць" веравызнаўчая).

— Што вы маеце на ўвазе пад "навязваннем"?

— Калі ў памяці чалавека замацавана, што прадзеды і дзяды, бацькі і старэйшыя браты-сёстры, заўжды гаварылі і яго вучылі гаварыць "Благавешчанне" — прычым так было не ў асобнай сям'і, а па ўсім краі, — то ніякі аўтарытэт ад сучаснай лінгвістыкі яго не перавучыць. Хочацца верыць, што аўтары згаданага вамі слоўніка і не імкнуліся дамагчыся гэтага. А мы тут, адкідаючы розныя "хочам — не хочам", на першы план павінны былі ставіць іншае: так замацавана традыцыяй і ўсёй гісторыяй мовы, а не толькі апошнім яе перыядам. Зразумела, у такім выпадку прызнаючы царкоўнаславянскую мову таксама сваёй. Інакш зноў і зноў будзем натыкацца на ство-

пасля Скарыны

раную ці прыдуманую самімі сабе перашкоду.

А пра канкрэтныя прыгаданыя вамі словы я не забыўся і паспрабую прывесці пэўныя аргументы. Напрыклад, “*благаславіць*”. Яно выкарыстана ў безлічы аўтэнтычных фальклорных запісаў, а таксама ў творах Скарыны, Буднага, Цяпінскага, Купалы, Коласа, Ластоўскага, Багдановіча, Гарэцкага, Геніюш, Салаўя і многіх іншых. Аўтары, як бачым, не толькі праваслаўныя. Нават Каліноўскі, вядомы як зацяты праціўнік Праваслаўя, таксама яго ўжываў.

— Што можна сказаць пра тэрміналагічную базу выдання? Наколькі яна распрацаваная і ці апрабоўвалася ў іншых выданнях Беларускай праваслаўнай царквы? Бо афіцыйнага тэрміналагічнага слоўніка для перакладу са стараславянскай мовы на беларускую пакуль што ў Беларусі няма.

— Калі мы чуем патрабаванне ўвесці “матчыну” мову ў богаслужэнні, гэта азначае, што яе зыходна лічаць “роўнасвяшчэннай”. А хто ж пасмее з належнай адказнасцю сцвярджаць, што беларуская мова стану 1920-х або 1980-х была такой ці хоць бы несумненна прыдатнай для такога менавіта выкарыстання? Баюся, ніхто ўсур’ёз не пасмее. Іншая справа — спробы, намаганні забяспечыць ёй такі статус. Вось Беларуская Біблійная Камісія і намагалася. Дзейсна. У любым выпадку, перакладаючы, назапашвала для гэтага “базу”. Напрыклад, выдавала штогод “Беларускі Праваслаўны Каляндар”, часопіс “Праваслаўе” (“Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце”), падрыхтавала беларускамоўны “Звод імёнаў святых” (1995) і “Кароткі царкоўнаславянска-беларускі слоўнік” (1996) і інш. Цяпер праца вядзецца непасрэдна над тэрміналагічным слоўнікам. Ну а ў якой меры наш слоўнік стане “афіцыйным”, залежыць не ад нас.

— Наколькі, на вашу думку, будзе запатрабаваны пераклад Новага Запавету сярод святароў і прыхаджан?

— Вядома ж, пераклад мае розныя функцыі: місійная, асветная, уласна лінгвістычная, літаратурная, агульнакультурная... Але, як бы там ні было, галоўная з іх — прысутнасць у богаслужэнні. Аднак перспектыву выкарыстоўваць беларускамоўнае Евангелле ў Царкве штодзённа і паўсюдна я не магу падсвечваць ружовымі надзеямі. Толькі прашу зразумець сказанае мной правільна і не ўскладаць, па завядзёнцы, усю віну на Беларускую Праваслаўную Царкву. Хіба сляпы не бачыць, што яна зрабіла ў гэтым напрамку вельмі многа. Увогуле ж, стан рэчаў у царкве непазбежна адлюстроўвае рэальны стан мовы, яе прысутнасць ва ўсіх іншых сферах.

— Ці плануе Багаслоўская камісія сваю працу далей? Ці збіраецца перакладаць на беларускую мову цяпер ужо Стары Запавет? Наколькі будзе ўлічаны вопыт па перакладзе Новага Запавету ў будучай працы?

— Канешне, працяг працы плануецца. Ужо таму, што зыходна задачай Камісіі з’яўляўся пераклад усяго Свяшчэннага Пісання, а не аднаго толькі Новага Запавету. А вось склад Камісіі, як мне здаецца, трэба абнавіць. Напрыклад, я асабіста з радасцю саступлю месца маладым спецыялістам, поўным сіл і дасведчанасці як у тэалогіі, так і ў філалогіі, якія добра ведаюць мову Старога Запавету. Працы тут новаму пакаленню яшчэ вельмі шмат. Благаславі яго, Госпадзі!

ПЕРСПЕКТЫВЫ АДЗІНАГА ПЕРАКЛАДУ

19 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч прэзентаваў першы поўны афіцыйны пераклад Новага Запавету на беларускую мову. Як адзначыла доктар тэалогіі, супрацоўніца Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі Марына ПАШУК, галоўная задача — данесці Божае Слова да вернікаў на сучаснай беларускай мове. Той мове, якая не будзе адштурхоўваць чытача, а зацікавіць ды заахвоціць яго да чытання. І каб вырашыць гэтую задачу, перакладчыкі доўга ішлі да канчатковага варыянту.

Марына Пашук.

— Як доўга цягнулася праца над перакладам Новага Запавету?

— Грунтоўная праца над перакладамі біблійных тэкстаў пачалася 15 гадоў таму. У ёй былі задзейнічаны прадстаўнікі ўсіх дыяцэзій Беларусі, тэолагі і філолагі. Перакладалі з арыгіналу — старажытнагрэчаскай.

— Ці не ўзнікала тут спрэчак паміж членамі камісіі адносна біблійнай тэрміналогіі? Скажам, якое слова лепш ужыць і гэтак далей?

— Справа ў тым, што ўсе члены Секцыі выхаваны ў каталіцкай традыцыі, таму асаблівых спрэчак паміж намі не было: мы глядзелі ў адзін бок. У тэксце мы пераважна захавалі прынятую ў Касцёле тэалагічную тэрміналогію, але там, дзе было неабходна, ужывалі і некаторыя яўрэйскія, арамейскія і грэчаскія словы, якія перадаваліся ў іх арыгінальным гучанні, але ў кірылічным запісе.

— Наколькі я ведаю, усе перакладзеныя тэксты спачатку змяшчаліся ў інтэрнэце. Гэта рабілася дзеля таго, каб усе ахвотныя маглі выказаць свае крытычныя заўвагі ці ўнесці нейкія прапановы?

— Менавіта так. У 2012 годзе на падставе апрацаваных тэкстаў Секцыя па перакладзе падрыхтавала і выдала чатыры Евангеллі з уступамі да кожнага з іх. Паралельна вялася праца над поўным перакладам іншых кніг Новага Запавету, якія паступова змяшчаліся на афіцыйным партале Каталіцкага Касцёла ў Беларусі. Падобная практыка будзе працягнутая і падчас перакладу ўжо Старога Запавету.

— Чым, на ваш погляд, адметнае выданне Новага Запавету, якое было прэзентавана цяпер у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі?

— У першую чаргу тым, што ў ім ёсць карты, прычым, вельмі дакладныя: падарожжаў св. Паўла, старажытнага Іерусаліма, Палесціны. Таксама змешчана храналагічная табліца, дзякуючы якой можна пазнаёміцца з гісторыяй Збаўлення. Ёсць таксама невялікі біблійны слоўнік: калі чытачы сустрэнуцца з нейкім незнаёмым словам у тэксце, можна проста зазірнуць туды і паглядзець, што яно азначае.

— Наколькі вамі ўлічваліся ранейшыя пераклады Святога Пісання на беларускую мову?

— Зразумела, не ўсе з іх раўнацэнныя, не ўсе павінны выкарыстоўвацца ў якасці ўзору для далейшых перакладчыкаў. Таксама тут варта адзначыць, што адметнай рысай беларускіх біблійных перакладаў з’яўляецца канфесійнасць. Розныя хрысціянскія вызнанні маюць свой падыход да перакладу, сваю тэрміналогію і рэлігійную лексіку.

— І ўсё гэта, натуральна, праяўляецца ў рэлігійных тэкстах?

— Так. На Беларусі існуюць дзве моцныя перакладчыцкія традыцыі — Slavia Latina і Slavia Ortodoxa (заходняя і ўсходняя традыцыі), што з’яўляецца своеасаблівым культурным і духоўным багаццем нашага народа. Таму да сёння для азначэння слова “Бог” у беларускай рэлігійнай літаратуры адначасова выкарыстоўваюцца 4 лексічныя адзінкі: *Пан, Спадар, Госпад і Гасподзь*. Для азначэння Бога-Сына існуюць варыянты *Езус, Ісус, Ізус, Ісус*. Прыклады можна доўжыць.

— А якімі філалагічнымі і тэалагічнымі крыніцамі карысталася Секцыя падчас перакладу Новага Запавету? Ці можна лічыць гэтыя крыніцы ўзорнымі і ці забяспечаны яны навуковым каментарыем?

— Падставай для перакладу паслужылі самыя новыя крытычныя выданні Новага Запавету, якія падаюць грэчаскія тэксты паводле найстаражытнейшых і найлепшых рукапісаў (кодэксаў). У сучаснай біблеістыцы гэтыя выданні лічацца найбольш поўнымі і аўтарытэтнымі ў святле новазапаветнай тэксталогіі. Таму менавіта яны і былі ўзятыя намі ў якасці асноўных для перакладу Новага Запавету на беларускую мову.

— Ці можна прывесці прыклады, калі, скажам, аўтарскія пераклады ўносілі нейкія свае дадаткі ці розначытанні ў тэкст Новага Запавету?

— Часта ў перакладах сустракаюцца пропускі слоў. Скажам, у першым поўным перакладзе Новага Запавету са старагрэчаскай на беларускую мову баптысцкага святара з Брэста Лукаша Дзекуця-Малея і вядомага палітычнага і грамадскага дзеяча, літаратурнага крытыка і публіцыста Антона Луцкевіча (1931 год), у тэксце Евангелля ад Мацвея (3 глава, 10 верш) па невядомай прычыне прапушчаны прыметнік “добры”: *кожнае дрэва, якое не дае (добрага) плоду, ссякаюць і кідаюць у агонь*, хаця гэты прыметнік ёсць ва ўсіх іншых перакладах. Цэлы сказ прапускае ў сваёй кнізе “Новы Запавет. Псалтыр” (1995 год) Васіль Сёмуха: *бо і грэшнікі любяць тых, хто іх любіць* (Лука, 6, 32). А розначытанні, напрыклад, можна сустрэць пры перакладзе назвы свята Шатроў (Ян, 7,2): яго называюць святам *Буданоў, Будак, Кучак, кушчаў, Палатак, Шатроў, Табэрнакаў*.

— На беларускую мову Секцыяй перакладзена ўжо 80 працэнтаў тэкстаў Старога Запавету. Калі можна будзе чакаць прэзентацыі перакладу поўнага тэксту Бібліі?

— Усё тут залежыць ад працы Секцыі, бо спяшацца з перакладам, натуральна, не варта. Праца ідзе, але калі яна скончыцца — ведае адзін Бог.

— На вашу думку, ці будзе калі-небудзь створаны міжканфесійны пераклад Бібліі на беларускую?

— Гэта перспектыва не сённяшняга дня і нават не заўтрашняга. Павінна, на маю думку, прайсці шмат гадоў, бо пакуль няма поўнага афіцыйнага перакладу ўсёй Бібліі на беларускую мову ні ў каталікоў, ні ў праваслаўных. Таксама ў Беларусі мусіць з’явіцца літаратура, якая будзе каментаваць гэтыя пераклады, бо ў нас яе пакуль таксама няма. Без гэтай базы казаць пра міжканфесійны пераклад, думаецца, яшчэ зарана. Акрамя таго, прадстаўнікам канфесій трэба дамовіцца пра адзіную крыніцу перакладу, бо сёння кожная канфесія ўжывае сваю крыніцу. Так што пытанняў, як бачыце, даволі шмат. Але гэта не значыць, што трэба апускаць рукі. Калі будзе згода паміж прадстаўнікамі розных канфесій Беларусі, усё, спадзяюся, будзе магчыма. У тым ліку — і міжканфесійны пераклад Бібліі. К

> *“Для азначэння слова “Бог” у беларускай рэлігійнай літаратуры адначасова выкарыстоўваюцца 4 лексічныя адзінкі: Пан, Спадар, Госпад і Гасподзь. Для азначэння Бога-Сына існуюць варыянты Езус, Ісус, Ізус, Ісус.*

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 52 / 30 СНЕЖНЯ 2017 г.
Art-блог 9

Каляды ў оперы

Каляндарны год у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі завяршылі, паводле традыцыі, дзве значныя падзеі. Абедзве — з грыфам “Мінскі міжнародны Калядны”: конкурс вакалістаў і оперны форум.

Надзея БУНЦЭВІЧ

У ЕДНАСЦІ — МОЦ!

Яднае іх не толькі агульная частка назвы. Трэці фінальны тур конкурсу, дзе лепшыя дзесяць спевакоў павінны прадставіць не набор арый, а сцэну са спектакля, трывала ўваходзіць у праграму форуму. А на заключным гала-канцэрце разам з сусветнымі зоркамі спяваюць новаспечаныя лаўрэаты і пераможцы мінулых гадоў. Тэатр мае рацыю: конкурс папулярызуе яго ва ўсім свеце, прычым адначасова як сярод спевакоў, так і сярод прадзюсараў, кіраўнікоў замежных тэатраў, якіх запрашаюць у журы. Канкурсанты знаёмяцца з тэатрам, дзе пры жаданні і адпаведных здольнасцях змогуць праявіць сябе і ў далейшым. Члены журы, якія прадстаўляюць не розныя педагагічныя школы, а розныя тэатры, бачаць спевакоў і спектаклі форуму (тыя ідуць увечары), якія можна будзе пры жаданні запрасіць да сябе.

Як справядліва заўважылі на “круглым стале” вядучыя крытыкі з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Баку, “яднанне конкурсу і форуму ў адзінае цэлае размыкае замкнёную сістэму рэпертуарных савецкіх і постсавецкіх тэатраў”. Сапраўды, вынікам калядных імпрэз стала больш частае з’яўленне ў нашых спектаклях выдатных маладых спевакоў з розных краін. У тым ліку са статусам “запрошаных салістаў”, што даўно стала нормай для Захаду. Спрыяльнае ўздзеянне конкурсу і фестывалю адчуваюць і іншыя постсавецкія тэатры. Як заўважыла доктар мастацтвазнаўства, прафесар Марына Чаркашына-Губарэнка (Украіна), “існуе сусветная імперыя оперы, але нашы тэатры, за выключэннем Марыінскага, туды пакуль не ўвайшлі. У нас свае задачы, якія і вырашае беларускі оперны. Тыя, хто, магчыма, не пройдзе на больш прэстыжнае сусветнае спаборніцтва, едзе сюды. І тэатр у Мінску ператвараецца ў лабараторыю па фарміраванні опернай змены”, літаральна ўзрошчваючы не проста вакалістаў, а менавіта оперных артыстаў — не адно для сябе, але і для ўсёй постсавецкай прасторы.

АГРАНКА “ГРАНПРЫСТАЎ”

На фоне такіх грандыёзных задач спрэчкі наконт таго, хто якое месца заняў і ці справядліва гэта было, уяўляюцца дробязямі. Недарэчнасці сустракаюцца на любым конкурсе, але па розных прычынах. Так, на нашым ніхто не “цягне” сваіх вучняў: вакальных педагогаў у складзе журы папросту няма. Але гэта не гарантуе стопрацэнтных вынікаў, бо крытэрыі ў кожнага з “суддзяў” свае — з прыцэлам на ўласны тэатр і ягоныя запыты. Невыпадкова на нашым конкурсе няма звыклых тэмбравых намінацый: усе спаборнічаюць з усімі, а не кожны з галасоў з сябе падобнымі. Да таго ж, пры выстаўленні балаў і далейшым падліку іх колькасці часяком здараюцца неспадзяванкі, калі ўверсе апынаюцца больш стабільныя спевакі, а не яркія асобы, здольныя рызыкаваць і выклікаць сваім выступленнем дыскусію.

Як бы тое ні было, уладальнікам Гран-пры другі год запар стаў прадстаўнік Арменіі: летась — тэнар Цігран Аганян, сёлета — бас Саргіс Бажбеук-Мелікян. Першая прэмія дасталася расійскаму барытону Сяргею Кайдалаву. Другую падзялілі ўкраінка Ксенія Бахрытдзінава і Марыя Галкіна (Беларусь), якая адразу атрымала запрашэнне ў трупу ад старшыні журы, генеральнага дырэктара нашага тэатра Маргарыта Ляўчук. Леташняя выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, яна актыўна канцэртавала ўжо ў часы свайго студэнцтва, плённа супрацоўнічала з Музычным Домам “Класіка”, атрымаўшы там добрую акцёрскую загартоўку і пачуццё сцэны. Вось і на Калядным конкурсе, які яна сумяшчала з удзелам у расійскім тэлепраекце “Вялікая опера-2017”, скарыла найперш псіхалагічнай дакладнасцю ўчынкаў і слоў сваіх гераінь — да найдрабнейшых дэталяў і эмацыйных адценняў. А гэта менавіта тое, што і вабіць нас у тэатры.

У астатнім усё было, як заўжды. Прыехала палова з тых, хто адправіў заяўкі (111 чалавек з 225-ці). Пераважная большасць канкурсантаў — з постсавецкай прасторы. На першым туры было шмат выпадковых удзельнікаў, але нашы канцэртмайстры імкнуліся “выцягнуць” кожнага хаця б выразнасцю сваёй фартэпіённай партыі. Другі тур, на жаль, прайшоў не на вялікай сцэне, як калісьці, а ў той жа рэпетыцыйнай зале, шага тэатра Уладзіміра Грыдзюшкі. Уладальніца не самага распаўсюджанага, але надзвычай запатрабаванага драматычнага сапрана, яна ўсе туры прайшла быццам “гуляючы”, лёгка і нязмушана дасягаючы моцнага, насычанага гучання, здольнага перамагчы любыя акустычныя складанасці залы.

Саліст нашага тэатра Аляксандр Гелах, не ўпершыню штурмуючы гэты конкурс, дабіўся-такі поспеху, падзяліўшы трэцюю прэмію з барытонам Канстанцінам Сучковым з Пермскага тэатра. Гелах і сапраўды зрабіў значны рывок наперад. Вядома, больш магутны, “сценабітны” голас немагчыма выхаваць ніякімі трэніроўкамі. Але даўно падмечана, што асаблівасцю беларускай вакальнай школы з’яўляецца не столькі наяўнасць шыкоўных ад прыроды галасоў, якія могуць абыходзіцца амаль без “агранкі”, колькі вынаходлівае ўменне распараджацца тым, што ёсць. У трэцім туры Аляксандр звярнуўся да сцэны і дуэта Мімі і Рудольфа з пучыніеўскай “Багемы”. І выканаў памеры якой не дазвалялі напоўніцу ацаніць акустычныя асаблівасці і сапраўдную моц галасоў. А сярод найбольш частых памылак, у тым ліку ў фінале, быў няправільны выбар рэпертуару.

ОПЕРА ЖЫВАЯ І МЁРТВАЯ

Сёлетні форум быў больш сціплым за мінулыя: чатыры спектаклі, з якіх адзін польскі і тры нашы (усе нашы — прэм’еры 2017 года), але з запрошанымі вы стрыжань”), і ледзь не плагіят (у першай і другой дзеях), і сэнсавую пустэчу, дзе ўсё перакулена з ног на галаву. Цікава, што рэзкія адмоўныя выказванні я чула ў закулісі яшчэ напярэдадні спектакля: маўляў, і трупа ў Беластоку слабенькая, і пастаноўка ніякага дачынення да оперы Бізэ не мае. Аказалася ж — усё наадварот: спектакль атрымаўся жывы, непрадказальны, у чымсьці дыскусійны, але цікавы як знаўцам, так і не спрактыкаваным у оперным жанры падлеткам — сапраўдная кульмінацыя форуму. На высокім узроўні (тут крытыкі былі аднадушнымі) аказаўся яго музычны складнік: мы пачулі выверваныя тэмпы, выдатныя галасы, цудоўную ансамблевую тэхніку.

Што ж да нашых прэм’ерных спектакляў, дык сабраныя разам, яны зрабілі яшчэ больш заўважнай тэндэнцыю да відовішчнасці — хай часам і за кошт парушэнняў элементарнай логікі. Сам па сабе такі кірунак цалкам слушны і вельмі запатрабаваны. Хвалюе іншае: за ўласна відовішчнымі эфектамі не заўсёды прасочваецца думка, нейкі новы сэнсавы складнік, актуальны для сучаснасці. Тут адным пераносам сюжэту ў іншую эпоху не абысціся! Дый драматычнае дзеянне не можа абмяжоўвацца рухамі па сцэне. Трэба яшчэ скіраваць гледача на роздум філасофская ці псіхалагічная кшталту, а лепей — адразу ў абодва бакі. У Польшчы, мяркуючы па “Кармэн”, гэта разумеюць.

Мы не ўбачылі ні цыганскіх спадніц, ні трывіяльных прыпадкаў рэўнасці ці пацверджання формулы “любовь зла...” Спектакль Падляскай оперы і філармоніі быў пра іншае — пра смерць (а яна ёсць у Бізэ — хіба прычыны іншыя). Пра хворае душой пакаленне, якое жыве “пасярод вайны”. Вылечыць, пазбавіць чалавека гэтай душэўнай скалечанасці не можа нават каханне.

Кадры нямога кіно з падкрэслена вытрыманай стылістыкай пачатку XX стагоддзя калі і выклікалі ўсмешку, дык пакуль не адкрылася заслона. Бо перад намі паўстала адна з сучасных “гарачых кропак” — без прывязкі да нейкай дакладнай геаграфіі. І нядаўна ўбачаныя кінакадры адразу выклікалі асацыяцыі з Першай сусветнай. На тое працавала і атмасфера кабарэ другой дзеі: павышаная запатрабаванасць у такіх установах узнікае тады, калі чалавек хоча “напіцца і забыцца” — не ад шчаслівага жыцця, а ад прадчування “ў апошні раз”. Трэцяя дзея з пераходам мяжы таксама нагадвала пра шматлікія прыклады незаконнага перакіду ўзбраення, дзе непасрэдныя выканаўцы — усяго толькі пешкі на шахматнай дошцы сапраўдных гульцоў. Вялізныя абрысы вееравў на сцэне, павольна складваючыся-раскладваючыся, ператвараліся то ў пагрозлівы “плаўнік акулы”, то ў дзіўныя канструкцыі відавочна ваеннага прызначэння, то ў нейкі брызентавы тэнт, то ў натапыраныя горныя вяршыні.

У такой атмасферы варожасці, якой дыхае ўсё наваколле і сама прырода, Мікаэла не можа заставацца “сціплай сялянкай” і, як хацелася б апалагетам традыцыяналізму, “пахнуць малаком ды гноем”. Таму тут яна — адвязны падлетак: палец у рот не кладзі. Гэткі пазнавальны тыпаж дзяўчынкі-сябрука, якая марыць пра прынца, ды не разумее, што мужчыны на вайне так прагнуць жаноцкасці.

Кармэн, калі верыць інтэрв’ю з рэжысёрам Беатай Рэдо-Добер, таксама павінна быць “колкай”. Дык што, наша Аксана Волкава, як засведчылі крытыкі, канчаткова разбурыла спектакль? На мой погляд, яна яго ўдасканаліла, дадаўшы тонкіх псіхалагічных ліній. Яе Кармэн шукае ў прыгажуне Хазэ найперш абароны: дастакова зірнуць, як яна туліцца да яго сваёй спінаю. Трагедыя ж Хазэ ў тым, што апынуўшыся на вайне, ён таксама пранікаецца павевамі варожасці, падазронасці, жорсткасці, неапраўданых выбухаў гневу (чым не актуальная сёння тэма сямейнага гвалту?). Кармэн не кахае Эскамільё: навошта ёй той аблыседы лавелас у бліскучай уніформе ці то касмічнага прышэльца, ці то фокусніка-блазна? Да гэткага “пустышкі” без звілін у галаве яна сыходзіць у парыве крыўды, каб адпомсціць за публічную знявагу. Але спярша робіць апошнюю спробу прымірэння, ласкава дакранаецца да шчакі Хазэ — той дэманстратыўна адварочваецца.

Кантраст святочнасці і трагізму, на якім пабудавана чацвёртая дзея, узмацняецца ў спектаклі адначасовым кантрастам бачнага і чутнага. У музыцы — свята. На сцэне — аўтаплены натоўп, які вітае “героя” пад прымусам і наглядам вайскоўцаў. Кармэн у вясельным строі побач з Эскамільё — быццам нябожчыца ў саване: стаіць ні жывая ні мёртвая, спявае завучаныя словы для публікі — у залу. Яна ўжо памерла, бо вымерла яе душа. І тое, што Хазэ душыць яе шалікам, — ці то выпадковасць, ці то самазабойства, спланаванае самой Кармэн, якая папярэдне вяжа на шыі вузельчык.

Увогуле, артысты — і нашы і запрошаныя — сталі лепшым упрыгожаннем усяго форуму. Пасля выступлення фіналістаў конкурсу, партнёрамі якіх былі салісты тэатра, так і хацелася ўручыць Гран-пры Станіславу Трыфанаву. У “Чароўнай флейце” немагчыма было не заўважыць не толькі знакамітага Юрыя Гарадзецкага (пазней у “Травіяце” ён выступіў у пары з “лепшай Віялетай свету” — Надзеяй Паўлавай), але і Ірыну Кучынскую, надзвычай артыстычнага Андрэя Кліпо. У “Сельскім гонары” — Кацярыну Галаўлёву, якая на наступны дзень правяла бліскучы сольны канцэрт з твораў Рахманінава. Выдатнай аказалася праграма заключнага гала-канцэрта: не было выпадковых салістаў, а сярод нумароў назбіралася шмат тых, якія рэдка гучаць на нашай опернай сцэне. А вось трэцяе аддзяленне конкурснага фіналу, калі ў час падліку галасоў на сцэну выйшлі нашы і запрошаныя маладыя салісты, аказалася не зусім роўным, асабліва ў выкананні старадаўняй музыкі (хаця, разам з тым, прыемна, што спевакі сталі часцей звяртацца да барока).

...Сёлетні конкурс быў 4-м, форум — 8-м. Кожная з лічбаў таксама мае сваю сімволіку: “чацвёрка” азначае стабільнасць, ураўнаважанасць, “васьмёрка” — бясконцасць. Гэта спалучэнне лічбаў і закладзеных у іх якасцяў абяцае нашаму опернаму “калядаванню” далейшы поспех. Хай жа спраўдзіцца “стабільная бясконцасць”! Асобныя ж дэталі заўжды можна ўдасканаліць.

К

"Кармэн".

"Травіята".

Маргарыта Ляўчук.

Крыху хорару ў бялюткім снезе

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Мачаха — Святлана Цімохіна.

Чым адрозніваецца выбітны рэжысёр ад рэжысёра-рамесніка? Моцны пастаноўшчык робіць класічны пераказ вядомай казкі, майстар жа шукае нестандартныя рэжысёрскія рашэнні ў збітай, здавалася б, гісторыі, пра якую кожны сярэднестатыстычны глядач дакладна ведае, “як павінна быць”. Ігар Казакоў якраз з тых, хто вынаходзіць нестандартныя магчымасці ў пацёртым да дзір рэпертуары.

У Беларускім дзяржаўным тэатры лялек галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра лялек Ігар Казакоў у другі раз прымае на сябе ўдар навагодняй кампаніі. Калі мінулым разам выбар паў на незвыклую для айчыннага зімовага лялечнага рэпертуару “Калядную гісторыю” паводле Чарльза Дзікенса, то зараз творца прапануе свой погляд на “Беласнежку”.

Матэрыял пастаноўшчыку знаёмы: тры гады таму разам з мастаком Таццянай Нерсісян ён ужо ставіў варыяцыю ўсім вядомай казкі на сцэне Гродзенскага абласнога тэатра лялек. Той спектакль быў у стылі поп. На сталічную сцэну Беласнежка прынесла атмасферу Сярэднявечча. Спадарыня Таццяна — нязменны суаўтар гучных спектакляў Казакова — цудоўна абыграла тую эпоху, абраўшы ядром сцэнаграфіі памост. Адсылка да вытокаў тэатральных выступленняў адкрыла магчымасць разварочваць дзеянне адразу ў некалькіх плоскасцях, надаючы даволі лінейнай гісторыі візуальную і сюжэтную шматпланавасць.

У цяперашнім сезоне мастак ужо ўзводзіла на тэатральных падмостках сцэну, гэтым разам давялося будаваць мур... які адразу ж “разламалі” гномы, ададаючы “пралом” пад дадатковае месца дзеяння і парадныя выхады галоўных герояў. Адмыслова спрошчаныя візуальныя хады дазваляюць з лёгкасцю дзіцячай фантазіі працаваць з аб’ектам, ператвараючы літаратурныя кроплі крыві ў сцэнічныя ружы, разбураныя рэшткі сцяны — у царскі трон, а запатрабаваныя па сюжэце каралеўскія строі “збіраць” з некалькіх лёгкіх штрыхоў, набліжаных да дзіцячых малюнкаў.

З дапамогай памоста ўдалося дадаткова абыграць і прыём тэатра ў тэатры: паводле Казакова, гісторыю Беласнежкі гледачам распавядаюць гномы, пераапранаючыся па ходзе сюжэта ў тых ці іншых персанажаў. На маёй памяці такі прыём рэдка выглядаў натуральна, аднак спадар Ігар мусіў ператварыць яго не толькі ў сапраўдную разыначку пастаноўкі, але і надаць дадатковую функцыю: абараніць ад працямерна жудасных фрагментаў сюжэту. Апошнім часам нам любіць нагадваць, што арыгінальныя казкі братоў Грым даволі жорсткія (пра тое гледачу ўсё па паліцах расклаў Яўген Карняг у колішнім “Інтэрв’ю з вядзьмаркамі”). Дык вось, такое пераадрасаванне, калі неадназначныя эпізоды — як, нарадзіўшы Беласнежку, яе маці памерла, як Мачаха патрабавала ў доказ аб забойстве падчаркі прынесці ейнае сэрца і зварыць яго, і іншыя — пераказваюцца забаўнымі гномамі, дапамагае пазбавіць тэкст ад змрочнасці першакрыніцы.

Дзівосная сямёрка гномаў — заслужаныя артысты Беларусі Аляксандр Васько і Аляксандр Казакоў, Любоў Галушка, Дзмітрый Чуйкоў, Ына Ганчар, Дзіяна Іванова, Цімур Муратаў — хуліганіць на сцэне, шуткуе, хахміць. Чаго толькі варты іскрамётны эцюд Цімура Муратава “Я — кавалак атручанага яблыка”! Дзякуючы такой выбудаванай імправізацыі спектакль набывае лёгкасць і дзіцячую непасрэднасць.

Разыгрываючы казку, гномы пераўвасабляюцца ва ўсіх персанажаў, і толькі вобраз Мачахі стаіць паасобку. Рэжысёр спектакля галоўны адмоўны персанаж сама становіцца ўсё больш падобнай. У мізансцэне з вядзьмарствам над атрутным зеллем люстраная маска прырастае велічэзнымі далонямі — візуалізаваная адсылка да таго, што чалавек сваімі рукамі будуе сабе пастку з беспадстаўных жарсцяў і надуманых інтрыг. Аднак, пры ўсім багацці сцэнаграфіі на цікавостці, зазначу, што самай запамінальнай стала мізансцэна, дзе няма ніякага чараўніцтва, а пануе вытанчаная ігра спадарыні Цімохінай: у момант, калі яе гераіня даведваецца пра правал свайго плана і ў злосным бяссіллі змінае абрус, прыцягваючы да сябе два падсвечнікі, Мачаха амаль наяве гасіць у сабе апошнія праявы душэўнага спачування.

І без таго моцна выбудаваны спектакль узбагацілі мноствам прыкметных зонгаў. Песні на музыку пастаяннага лялечнага кампазітара Аляксандра Літвіноўскага былі створаны Рыгорам Гольдманам і Аляксандрай Даньшовай. Шкада, што частка з іх запісана ў плюсавай фанаграме — у тэатры маюцца шыкоўныя галасы... Некалькі выкананых жыўцом нумароў адразу надалі персанажам дадатковыя характарныя фарбы. Здавалася б, што можна зрабіць з эпізадычнага Прынца? У Дзмітрыя Чуйкова ж атрымалася ў некалькі накідаў стварыць вобраз нясмелага, абаяльнага каралевіча са шчырымі пачуццямі.

Пастаноўка, зробленая на жывую нітку, мае шмат патэнцыйных крыніц, якія па законе жанру будуць паступова раскрывацца з кожным сыграным спектаклем. Гледачоў жа ўжо можна павіншаваць са з’яўленнем сярод шматлікіх аднадзёнак зімова-святочнай афішы ўдумлівай казкі для сямейных разваг.

К

Наступная сустрэча з “Беласнежкай” ужо 5 і 6 студзеня.

Вось якім ты быў, 2017-ты

Напрыканцы года мы вырашылі звярнуцца па тэлефоне да кіраўнікоў абласной культуры і пацікавіцца, чым адметны быў для іх 2017-ты. Атрымалася, як нам падаецца, выразная мазаіка падзей, фактаў і дасягненняў, якая сваёй яскравасцю яшчэ раз пацвердзіла: наша нацыянальная культура развіваецца імкліва, і кожны год гэтага руху не падобны на папярэдні.

Яўген РАГІН

БРЭСТЧЫНА: помнік Бібліі

Па меркаванні намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Сяргея Панасюка, адной са знакавых падзей года стала частковае адкрыццё Косаўскага палаца.

Не менш рэзананснымстаў XXII Міжнародны тэатральны фестываль "Белая вежа". А днямі ля абласной бібліятэкі быў урачыста адкрыты помнік Бібліі скульптара Антона Нічыпарука. Помнік уяўляе з сябе разгорнутую кнігу з надпісам "Брэсцкая Біблія. 1563". Тэрыторыя вакол помніка ўзорна добраўпарадкавана і з'яўляецца месцам адпачынку чытачоў абласной бібліятэкі.

Важнай падзеяй падалася Сяргею Панасюку і ваенна-гістарычная рэканструкцыя перыяду Першай сусветнай вайны ў вёсцы Скокі, што пад Брэстам. Тут, у палацы Нямцэвічаў, было падпісана перамір'е (Брэсцкі мір) паміж Германіяй, яе саюзнікамі з аднаго боку і з бальшавіцкай Расіяй — з другога.

ВІЦЕБШЧЫНА: нават у клёцкі ёсць душа

З прыемнасцямі года падзялілася выконваючая абавязкі намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Галіна Баркевіч. Якасна павысіўся, зазначыла яна, выканальніцкі ўзровень самадзейных мастацкіх калектываў.

Агульная колькасць заслужаных аматарскіх калектываў Рэспублікі Беларусь на Віцебшчыне даведзена сёлета да пятнаццаці. Гэтае званне атрымаў і ансамбль песні і танца Гарадоцкага ГДК "Яблынька".

Пашырыўся і спіс нематэрыяльнай спадчыны. Да дзесяці наяўных каштоўнасцей дадаліся яшчэ дзве: прыгатаванне клёцак з душамі ў Лепельскім раёне, традыцыя вясельных абрадаў на Дубровеншчыне. Аказваецца і ў клёцак ёсць душа (мясное ці іншае змесціва ў абалонцы з цеста, якая называецца "цела").

Паспяхова рэалізавана праграма "Традыцыйны касцюм Віцебскай вобласці". Інакш кажучы, у кожным раёне гэты касцюм рэканструяваны. Цяпер ідзе падрыхтоўка фотаальбома, які будзе прэзентаваны ў студзені. "Вішнёвы фэст" у Глыбокім і конкурс юных выканаўцаў "Халі-Хало" ў Наваполацку набылі статус міжнародных. Да гэтага набліжаецца пакрысе і "Фестываль дзвюх рэк" у Докшыцах.

ГОМЕЛЬШЧЫНА: лічбавае кіно ў Чыркавічах

Падзей, цікавых і розных, лічыць першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Інга Заўгародняя, было, як і заўжды, шмат. Да прыкладу, можна назваць юбілей мясцовай філармоніі, якой споўнілася 50 гадоў.

Вялікі канцэрт усіх мастацкіх калектываў установы прайшоў у Гомельскім грамадска-культурным цэнтры. Сістэмна развіваецца Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва "Славянскія тэатральныя сустрэчы". Сёлета ладзіўся ўжо трынаццаты па ліку форум.

Калі ж казаць пра развіццё рэгіёнаў, дык на першы план выходзіць завяршэнне рэканструкцыі кінатэатра "Спадарожнік" у аграгарадку Чыркавічы Светлагорскага раёна.

Выяўленне і падтрымка талановітых навучэнцаў — застаецца асноўнай мэтай дзіцячага конкурсу "Музыка надзеі". У Гомелі прайшоў заключны этап ужо пятнаццатага па ліку. Сёлета ў ім бралі ўдзел прадстаўнікі Малдовы, Латвіі, Расіі, Беларусі.

Косаўскі палац. / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

ГРОДЗЕНШЧЫНА: яшчэ адзін замкавы ракурс

А вось меркаванні начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра Вярсоцкага. Да слова, заспелі мы яго па дарозе ў Ліду. У перадапошні тыдзень года там адкрывалася паўночна-ўсходняя вежа Лідскага замка.

Пачала дзейнічаць у гэтай вежы і музейная экспазіцыя, якая, натуральна, будзе пашырацца і ўдасканальвацца.

Больш прывабным для турыстаў становіцца Аўгустоўскі канал. Адмысловая музейная экспазіцыя дзейнічае ў Дамку даглядчыка. Адметныя брэнды займелі бліжэйшыя паселішчы. У гарпасёлку Сапоцкін, да прыкладу, можна наведаць Музей пісанкі. У вёсцы Зарачанцы — Музей ручніка і ваеннай формы. А ля вёскі Стрэльчыкі, непадалёк ад Гродна, для наведвання турыстаў адкрылася адно са збудаванняў Гродзенскай крэпасці — форт № 4.

Археалагічныя работы вядуцца на Старым замку, будаўнічыя распачнуцца ў наступным годзе. Выдаткаваны сродкі на захаванне Каложскай царквы і рэшткаў Крэўскага замка. Ёсць спадзеў, што сітуацыя зменіцца да лепшага і ў дачыненні Гальшанскага замка.

МАГІЛЁЎШЧЫНА: статус перададзены, а сімвал застаўся

Дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Алег Хмялькоў галоўнай падзеяй года назваў (хто б здзіўляўся!) тое, што Бабруйск з'яўляўся Культурнай сталіцай Беларусі.

За гэты час у Бабруйску было праведзена паўтары тысячы самых розных па жанры мерапрыемстваў. 15 снежня горад перадаў свой статус Наваполацку. Але сімвал "сталічнасці" застаўся. Маецца на ўвазе бронзавая выява дзяўчыны ў нацыянальнай вопратцы і з кнігай у руках, на старонцы якой пазначана "Культурная сталіца Беларусі". Скульптура работы Аляксандра Шапо ўсталявана ля Палаца мастацтваў. Незабыўным стаў і VI фестываль нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Ён ладзіцца ў Бабруйску раз на два гады.

Магілёўшчына ўпершыню прыняла фестываль творчасці інвалідаў Саюзнай дзяржавы "Разам мы зможам больш". Мерапрыемства прайшло на базе абласнога метадычнага цэнтра. У ім бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі і шасці расійскіх рэгіёнаў. Артысты паказалі здольнасці ў народных, акадэмічных, эстрадных і жэставых спевах, харэаграфіі, тэатральным мастацтве, аўтарскай паэзіі, у дэкаратыўна-прыкладным і выяўленчым мастацтвах. Словам, падзея сталася досыць рэзананснай.

МІНШЧЫНА: у госці да кампазітара

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок папрасіла падкрэсліць ініцыятыўнасць работнікаў культуры Чэрвенскага раёна. Яны здолелі атрымаць праанаўскі грант на стварэнне ў гарадскім пасёлку Смілавічы Музычнай гасцёўні кампазітара Станіслава Манюшкі.

Дапамог праект "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь". Пад гасцёўню адведзены будынак былой дзіцячай мастацкай школы. Тут выступаюць з камернымі канцэртамі мясцовыя выканаўцы і артысты Белдзяржфілармоніі. Ёсць і экспазіцыя, што распавядае пра жыццё і творчасць сусветнавядомага музыканта.

Як і заўжды, маштабнай і відовішчнай была рэканструкцыя эпічнай падзеі 1812 года — бітвы расійскіх і французскіх войскаў на Беразіне пад Барысавам.

Знакавай стала і прэзентацыя Міншчыны ў Дзелавым культурным цэнтры Масквы.

К

Тук, тук. Хто там? Снегавік!

Хочацца лёгкага марозчыку і нетаропкага прыгожага снегападу. Без гэтага якая казка Новага года? Спрэс проза дажджлівага золкага снежня. Дзятва на двары разы тры спрабавала вылепіць снегавіка, атрымлівалася нешта бруднае, сюррэалістычнае. І так па ўсёй Беларусі. Вось у якіх умовах даводзіцца працаваць нашым работнікам культуры. Але трэба аддаць ім належнае: з абавязкамі сваімі яны спраўляюцца на "выдатна": ствараюць казачны навагодні настрой.

Яўген РАГІН

Сцежка казак на Аўгустоўскім канале.

У **Ганцавіцкім** раённым доме рамёстваў, да прыкладу, працуе выстава "Цуд на Каляды". Ладзяцца майстар-класы па вырабе казы і зоркі, павука, калядных масак і вянкоў, паштовак з выцінанак. У гэтых мерапрыемствах актыўны ўдзел бяруць сябры народнага клуба майстроў "Багач". А на шчодры вечар, паведамляе дырэктар РДР Маргарыта Саламевіч, да работнікаў культуры раённага цэнтра завітаюць сельскія фальклорныя калектывы. Будзем спадзявацца, што да гэтага часу надвор'е таксама стане святочным.

Андрэй Струнчанка піша: *"У* **Віцебскім** *абласным метадычным цэнтры народнай творчасці дзейнічае абласная выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Карнавал масак". Экспануюцца выцінанка, саломкапляценне, мастацкі роспіс, аўтарская лялька, кераміка, вышыўка, сюжэтныя кампазіцыі і арт-аб'екты на навагоднюю тэму. Падчас вернісажу выставу аздобілі выступленні народнага харэаграфічнага калектыву "Карнавал" унітарнага прадпрыемства "Віцебскаблгаз" і ўзорны тэатр моды "Дзіва" Віцебскага гарадскога цэнтра дзяцей і моладзі".*

У **Магілёве** ладзіўся конкурс мастацтваў "Art Kids". Наш актыўны пазаштатны аўтар, настаўнік дзіцячай школы мастацтваў № 3 **Барані** Наталля Латышава паведамляе, што ад гэтай установы ў конкурсе бралі ўдзел і атрымалі дыплом II ступені навучэнцы харэаграфічнага аддзялення: малодшая і старэйшая групы танцавальнага калектыву Online, а таксама — ансамблі "Фіксікі" ды "Калейдаскоп", якія адзначаны дыпломамі трэцяй ступені.

Інфармацыя ад аддзела метадычнай работы **Ашмянскага** раённага цэнтра культуры. Гаворка — пра гарадское тэатралізаванае свята "Навагодні карнавал" з цырымоніяй урачыстага запальвання галоўнай ёлкі раённага цэнтра. На свяце выступілі дзіцячыя творчыя калектывы раёна.

На **Аўгустоўскім** канале пачалі дзейнічаць сцежка казак, алея пор года, навагодняя пошта, казачныя сані, якім ужо больш за паўстагоддзя. Галоўны бібліятэкар па арганізацыйна-маркетынгавай дзейнасці **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Людміла Трубчык распавядае, што непадалёк ад шлюзу "**Дамброўка**", у вёсцы **Кадыш**, пасяліўся Дзядок-Лесавік, які частуе ахвотных гарбатай ды блінцамі. У названых мерапрыемствах бяруць актыўны ўдзел работнікі **Сапоцкінскай** гарпасялковай, **Квасоўскай**, **Свіслацкай**, **Раціцкай**, **Падлабенскай** сельскіх бібліятэк Гродзенскага раёна.

І яшчэ адна інфармацыя ад Людмілы Трубчык. За тры дні супрацоўнікі перасоўнай бібліятэкі і інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела павіншавалі з навагоднімі святамі жыхароў вёсак **Мількаўшчына, Ханевічы**, **Гліняны**, **Пясчанка**, **Гальнка**, **Гінавічы**, **Кадыш**, **Кулакоўшчына**, **Чарток**, **Сонічы**, а таксама — сталых людзей і медыцынскі персанал з дома-інтэрната ў вёсцы **Белыя Балоты**.

К

*

Сацыяльная адказнасць бізнесу, як вядома, праяўляецца не ў словах і абяцаннях, а ў сапраўдных справах. Гэтую выснову сёння разумеюць і цалкам падзяляюць многія флагманы беларускай вытворчасці. Сярод такіх лідараў стала і надоўга "прапісаўся" Гродзенскі мясакамбінат. Да ўсяго, ён з'яўляецца ўладальнікам унікальнага агратурыстычнага комплексу "Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы", які часам нават называюць айчынным "дыснейлэндам".
Цяпер "Каробчыцы" — адзін з самых дагледжаных куткоў Гродзеншчыны, а таксама і бадай самы запатрабаваны тураб'ект. У выхадныя сюды прыязджаюць да 3 тысяч чалавек. Пра гэты, знакаміты на ўсю вобласць ды, бадай, і на ўсю Беларусь сацыяльна-культурны аб'ект, далейшыя перспектывы яго "раскруткі", сацыяльнае жыццё прадпрыемства і многае іншае "К" пагутарыла з генеральным дырэктарам ААТ "Гродзенскі мясакамбінат" Анатолем ГРЫШУКОМ.

Генеральны дырэктар ААТ "Гродзенскі мясакамбінат" Анатоль Грышук на свяце, прысвечаным Дню абароны дзяцей.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Айчынны "дыснейлэнд" непадалёк ад Гродна

Пра "Каробчыцы", дэндрапарк і "капуснікі" на фоне беларускай флоры і фаўны

Студыя танца "Ассорти".

Свята ў "Каробчыцах".

— Анатоль Георгіевіч, усё ж агратурыстычны комплекс — не асноўная сфера дзейнасці мясакамбіната. Якім чынам паўстала задума стварэння гэтага сацыяльна-культурнага аб'екта?

— Справа ў тым, што я вельмі люблю прыроду, часта вандрую як па Беларусі, так і па замежных краінах у якасці аматара-рыбалова. Нават калісьці хацеў стаць біёлагам і вывучаць навакольнае асяроддзе. Таму, калі паўстала ідэя стварэння такога сацыяльна-культурнага комплексу, дзе, як меркавалася, будзе прадстаўлена беларуская і замежная флора і фаўна, я адразу даў для гэтага праекта "зялёнае святло". Акрамя таго, не варта забываць, што "Каробчыцы" ў многім — рэкламны праект, які станоўча ўплывае на імідж нашага прадпрыемства.

— Падобнымі сацыяльна-культурнымі пачынамі (хай сабе і ў рэкламных мэтах) могуць пахваліцца сёння далёка не ўсе буйныя айчынныя прадпрыемствы. Тым больш, як я зразумеў, фінансавай аддачы гэты праект не прадугледжваў?

— Гэта сапраўды так. Мы больш арыентаваліся на дзяцей, дакладней, на бацькоўскі і сямейны адпачынак з дзецьмі. Таму і стварылі ў "Каробчыцах" гульнявыя зоны, збудавалі стайню з пародзістымі скакунамі, абсталявалі па ўсім парку вальеры з дзікімі і свойскімі жывёламі. Ёсць у нас і кузня, і дом разьбяра па дрэве, і музей прыроды. Гэта кожнаму прыйдзецца даспадобы, асабліва дзецям ці падлеткам. Прыбытак для нас быў не галоўным у гэтай справе, хаця варта адзначыць, што "Каробчыцы" сёння сябе акупляюць.

— Мне калісьці самому давялося пабываць у "Каробчыцах". Вельмі быў здзіўлены разнастайнасцю мерапрыемстваў, якія ладзілі мясцовыя супрацоўнікі для дзяцей: ад традыцыйнага Купалля да конкурсу прыгажосці сярод поні. Але, наколькі я ведаю, не забываеце вы і пра патрыятычнае выхаванне: я маю на ўвазе стварэнне ў межах комплексу партызанскага лагера.

— Сапраўды, яшчэ ў 2011 годзе ў нас быў адкрыты аб'ект, які мае патрыятычнае значэнне і называецца гісторыка-культурны комплекс "Гродзенская крэпасць. Партызанскі лагер". Гэты мемарыял ствараўся пры падтрымцы ветэранаў, а таксама пры супрацоўніцтве з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Дарэчы, як я заўважыў, многія турыстычныя аўтобусы з Літвы, Латвіі, Расіі, перш чым заехаць у "Каробчыцы", едуць менавіта да гэтага гісторыка-культурнага комплексу. Не так даўно мы ўсталявалі на тэрыторыі мемарыяла капліцу, дзе літаральна кожны можа ўскласці кветкі, запаліць свечку і памаліцца за тых, хто загінуў падчас Другой Сусветнай вайны.

— Пра перспектывы развіцця агратурыстычнага комплексу "Гарадзенскі маёнтак "Каробчыцы" пагаворым? Ці гэта камерцыйная таямніца?

— Ніякіх таямніц! Планы ў нас сапраўды вялікія: па-першае, зрабіць буйны дэндрапарк, дзе будуць прадстаўлены кветкі і дрэвы з усёй Беларусі, па-другое, ладзіць у "Каробчыцах" рок-фестывалі і даваць пляцоўку для розных музычных гуртоў і народных ансамбляў, па-трэцяе, збудаваць альтанку ў выглядзе старадаўняга замка. А яшчэ мы абавязкова працягнем традыцыю правядзення на тэрыторыі агракомплексу міжнародных пленэраў рэзчыкаў па дрэве. Тым больш, што такія драўляныя скульптуры, выкананыя самабытнымі майстрамі па матывах дзіцячых казак, вельмі падабаюцца як дзецям, так і дарослым. Кажу гэта ўпэўнена, бо калі бываў у "Каробчыцах", не раз бачыў захопленыя дзіцячыя вочы і шчырыя ўсмешкі. Асабліва падчас святкавання Дня прадпрыемства, калі ў комплекс адначасова прыязджаюць 1200 — 1500 нашых супрацоўнікаў з дзецьмі.

— Але ж сацыяльнае жыццё камбіната гэтай важнай падзеяй яўна не абмяжоўваецца...

— Адзначаем на прадпрыемстве сіламі нашых супрацоўнікаў усе тэматычныя святы. Асаблівая ўвага — Новаму году. Напярэдадні я і Дзед Мароз са Снягуркай ходзім па вытворчых цэхах, раздаём падарункі, віншуем усіх і жадаем самага найлепшага. Таксама можам папрасіць каго-небудзь прачытаць дзіцячы вершык на памяць, а кагосьці — патанцаваць. Гэтую ідэю — хадзіць з Дзедам Марозам па цэхах — падгледзеў на адным польскім мясакамбінаце падчас камандзіроўкі. І адразу вырашыў, што абавязкова вазьму на ўзбраенне такі карысны вопыт святкавання Новага года. Цяпер магу сказаць, што ідэя "прыжылася" і нават пайшла "на ўра".

— Можа, удалося штонебудзь яшчэ падгледзець у сацыяльнай сферы замежжа? Або творча пераасэнсаваць?

— Спашлюся на наш, ужо айчынны вопыт. Напрыклад, я вельмі ганаруся нашымі юнымі артыстамі, якія займаюцца ў студыі танца "Ассорти", створанай пры інтэрнаце прадпрыемства. Дзеці тут — сапраўдныя таленты. Яны пастаянна бяруць удзел у розных імпрэзах, якія праводзяцца на нашым камбінаце, выклікаючы шчырае захапленне ўсіх супрацоўнікаў. Ды і на абласных і міжнародных конкурсах не раз выступалі, былі нават на Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Прычым кожны раз вярталіся з дыпломамі і ўзнагародамі. Вось і зусім нядаўна прыехалі з перамогай з абласнога тура XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які прайшоў у Лідзе. Цяпер будзем рыхтавацца да рэспубліканскага тура конкурсу ў Гродне. Спадзяюся на перамогу і тут, бо, як кажуць, родныя сцены заўсёды дапамагаюць.

— А ўвогуле, ці шмат ладзіцца культурных мерапрыемстваў сіламі супрацоўнікаў? Ёсць нейкія лічбы, факты, прыклады?

— За прыкладамі далёка хадзіць не трэба: гэта і ўшанаванне лепшых, і канцэрты ды "капуснікі", конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы, творчыя выставы... Вось далёка не ўвесь пералік мерапрыемстваў і акцый, якія арганізуюцца саматужна нашымі супрацоўнікамі, але, як я лічу, на вельмі высокім узроўні. Зазначу, што сёння некаторыя культурныя імпрэзы выйшлі далёка за межы нашага прадпрыемства. Так, мы ладзім дабрачынныя святы, прысвечаныя Міжнароднаму дню абароны дзяцей. У "Каробчыцы" прыязджаюць тысячы дзетак з дзіцячых дамоў, інтэрнатаў, шматдзетных сем'яў Гродзенскай вобласці. Прычым ладзім мы іх на рэгулярнай аснове. Прайшла такая акцыя і сёлета.

— А ці задзейнічана пры правядзенні культурных мерапрыемстваў моладзь? У якасці валанцёраў, удзельнікаў конкурсаў ці арганізатараў?

— Безумоўна! На мой погляд, укладанне сіл ва ўмацаванне маладой сям'і і ў пераемнасць пакаленняў — самае надзейнае і неабходнае. Таму пры інтэрнаце ў нас працуюць шэраг спартыўных гурткоў, створаны ўмовы для заняткаў спортам. Маладых супрацоўнікаў мы ўрачыста прымаем у склад калектыву, ладзім да Дня сям'і "Парад дзіцячых вазкоў", свята "Тата, мама, я — дружная сям'я" і многія іншыя. А яшчэ шэраг супрацоўнікаў прадпрыемства, якія ўваходзяць у грамадскае аб'яднанне Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, сёлета пазмагаліся ў конкурсе за званне "Найлепшы маладзёвы працоўны калектыў года" і занялі ганаровае трэцяе месца ў фінале гарадскога конкурсу "Мы — разам".

— Што б вы, Анатоль Георгіевіч, пажадалі чытачам газеты "Культура" ў Новым годзе?

— Жадаю ўсім усяго самага найлепшага, а асабліва сяброўства, узаемадапамогі, здароўя і аптымізму ў Новым, 2018-м годзе. Хай збываюцца ўсе вашы мары! А яшчэ — прыязджайце ў "Каробчыцы". Паверце — вы пра тое не пашкадуеце!

К

У дзяцінстве мне было вельмі прыемна атрымліваць навагоднія паштоўкі ад цёці з Амерыкі — яны заўсёды былі такімі прыгожымі, што я хавала іх у вялікія кнігі, каб выпадкова не пакамечыць. Цяпер жа, здаецца, усе дасылаюць электронныя віншаванні праз Facebook ці Viber. Або амаль усе, бо нехта перад святамі карпее ў сваіх студыях, друкуючы адмысловыя паштоўкі — PF. Для кагосьці гэта проста дзве літары, а для кагосьці — асобны від мастацтва. Спецыяльна для "К" напярэдадні Новага года фатограф Аляксей Ільін пашукаў у сваім архіве самыя цікавыя PF-віншаванні, якія рабіў сам ці атрымаў у падарунак.

Паштоўка на шчасце

Ганна ШАРКО

Аляксей Ільін. / Фота Веранікі ВЕЛЬБ.

Традыцыя абменьвацца перад Новым годам фотапаштоўкамі сфарміравалася прыкладна ў 1930-я гады ва Усходняй Еўропе. Гэта былі святочныя здымкі-віншаванні на паперы невялікага фармату, на якіх аўтары абавязкова пазначалі год, ставілі свой подпіс і дадавалі дзве літары PF. З французскай мовы абрэвіятура расшыфроўваецца як Pour Feliciter — "каб павіншаваць", а з італьянскай як Po Felicita — "на шчасце". Такімі карткамі абменьваліся па пошце ці проста перадавалі іх з рук у рукі. Крыху пазней пра PF сталі пісаць часопісы "Ревю Фотография" і Ceskoslovenska Fotografie, дзе ў снежаньскіх нумарах звычайна друкаваліся паштоўкі, якія дасылалі ў рэдакцыю аматары фатаграфіі.

У Мінск гэтая традыцыя прыйшла ў пачатку 1980-х гадоў дзякуючы ініцыятыве слайдклубу "Спектр", які месціўся ў будынку Палаца прафсаюзаў. Сярод удзельнікаў аб'яднання быў і Аляксей Ільін, які разам са сваімі сябрамі ў часопісе Ceskoslovenska Fotografie знайшоў артыкул, прысвечаны PF. Тэкст з чэшскай пераклалі на рускую мову, і ён пайшоў у народ. Як потым і сама з'ява.

— На паштоўцы павінна быць выява, зробленая менавіта вамі, паколькі яна — візітная картка фатографа за мінулы год, — тлумачыць Аляксей. — Вы можаце надрукаваць свой здымак, які лічыце найлепшым, пейзаж ці аўтапартрэт — у жанравым плане няма ніякіх абмежаванняў. Лепей, канешне, ніколі не паўтарацца.

Стыль паслання аўтар фарміруе сам. Ён сам выбірае, якім шрыфтам карыстацца і якой павінна быць рамка паштоўкі. Такі сінтэз фатаграфіі і дызайну набліжае PF да жанру фатаграфічнай мініяцюры.

Разам з Аляксеем Ільіным мы пераглядзелі яго PF-калекцыю і ўбачылі, як віншавалі адзін аднаго беларускія фатографы і пяць, і трыццаць гадоў таму.



1. Гэты здымак зроблены ў Кіеве маноклем, потым адбітак быў таніраваны ў тон сепіі. З Кіевам у мяне звязаныя самыя цёплыя ўспаміны — туды я ездзіў да свайго лепшага сябра Сяргея Сяргеевіча Сяргеева. Пакуль жыў у яго, кожны дзень шпацыраваў па вуліцах горада, фатаграфаваў. Таніраванне надае здымку сонечнасці. Я ўвогуле супраць цёмна-карычневых адценняў, звычайна выкарыстоўваю разбаўленыя фарбавальнікі, каб атрымаць лёгкае адценне ад светла-жоўтай гамы да залацістай ці светла-карычневай.

2. Падарунак ад фатографа Аляксея Паўлюця. Мне вельмі падабаецца гэта PF-ка! Ёсць такі выраз "Блюз — гэта калі добраму чалавеку крышачку дрэнна". Вось тут мы бачым фатаграфічны блюз: лёгкі сум па годзе, які завяршаецца, і ў той жа час светлы водбліск свечак. Тут няма ніякага цяжару — і гэта цудоўна.



3. Здымак зроблены панарамнай пінхол-камерай (самаробнай стужкавай камерай з маленькай дзірачкай у корпусе — "К"). З аднаго боку, гэта дэманстрацыя тэхнікі, якой я займаюся (Аляксей заснавальнік мінскага клуба аматараў пінхол-фатаграфіі — "К"), а з іншага — пажаданне ўсім знайсці сваё мора. Фота з маленькага гарадка Арджанікідзэ ў Крыме.

4. Паколькі ялінка экспаніравалася з вялікім недахопам вытрымкі, гэта адзіны здымак, які атрымаўся на стужцы, зараджанай у запалкавую скрынку, — расказвае Аляксей. — Фатаграфія выйшла настолькі добрай, што адразу пайшла на PF-ку! Увогуле пінхол і манокль часта выкарыстоўваюць для паштовак, бо гэтыя тэхнікі даюць магчымасць разгуляцца фантазіі.

5. Гэта PF маёй сяброўкі Алісы, якая вельмі любіць Адэсу, таму ездзіць туды ў розны час і прывозіць адтуль шмат здымкаў мора. На фота адлюстравана хутчэй не пажаданне, а эмоцыя, паэтычны настрой, вернасць мору.

6. Паштоўка зроблена ў тэхніцы мантажу, калі з негатыва друкуецца пазітыў, а потым з яго зноў негатыў, на якім тушшу замалёўваюцца сілуэты сяброў. Потым з негатыва кантактным спосабам яшчэ раз друкуецца пазітыў — і мы бачым вынік. Вось такая аўтарская тэхналогія.

7. Анічкаў мост, Санкт-Пецярбург — конь у кані да Году каня! Лічбавы мантаж, зроблены ў графічным рэдактары. Увогуле, ёсць шмат PF-ак са здымкамі жывёл, якім быў прысвечаны год — гэта можа быць і вельмі простая сюжэтная фатаграфія, і нешта абстрактнае.

8. У PF няма межаў, і ў гэтым ёсць вялікі плюс — ты можаш рабіць усё, што захочаш, ці проста жартаваць. Як, напрыклад, на паштоўцы, дзе ўсім задаволеная істота спіць адкінуўшы лапы. Добрае пажаданне паўнавартаснасці падарожжаў!

Нью-Ёрк планам не верыць

Алег КЛІМАЎ /
Фота Аляксандра ТАРАНЦІНА

Яшчэ не так даўно Таццяна ЗАМІРОЎСКАЯ была вядомая як адзін з вядучых айчынных музычных крытыкаў і яркі прадстаўнік мінскай культурнай тусоўкі. Цяпер усё змянілася. У 2015 годзе яна з'ехала ў ЗША — прычым не па смачнейшы хлеб, а найперш па новы жыццёвы досвед. Геаграфічная адлегласць не перашкодзіла нам яе там дастаць і даведацца, як ёй жывецца ўдалечыні ад радзімы.

ПАШЫРЫЦЬ КАНТЭКСТ...

— Ты неаднаразова бывала ў ЗША. Што гэтым разам туды прывяло?

— Упершыню я прыехала ў Нью-Ёрк летам 2009 года ў госці да сябра, бо хацела зразумець, што ўсе знаходзяць у гэтым горадзе. Чаму людзі вяртаюцца ў яго зноў і зноў, ажно пакуль не застануцца? Я гэта так і не зразумела, але перажыла (пражыванне — добрая альтэрнатыва разуменню).

У мяне з'явілася магчымасць атрымаць тут магістарскую адукацыю — гэта была мая мара, павучыцца ў ЗША. У Мінску ў мяне быў імідж нейкага "псіхадэлічнага" аўтара, які піша нешта незразумелае, аналізуе тутэйшую хтонь (падземны свет або, іншым словам, андэрграўнд — **А.К.**) і сюррэалістычны побыт. Гэта ўсё дрэнна ўплывае на самасвядомасць, бо калі ты пашыраеш кантэкст, раптоўна бачыш сябе чалавекам, якому трэба яшчэ вучыцца і вучыцца. Зрэшты, нават пры жаданні нешта пашырыць я б не адважылася проста ўзяць і кудысьці паехаць — але так склаліся абставіны. Жыццё кароткае, калі ёсць магчымасць спрабаваць іншыя ягоныя варыянты — чаму б і не?

— Што скажаш аб амерыканскай культуры?

— Я літаральна ўзгадаваная ёй, асабліва кніжнай — пісьменнікі-бітнікі, Бероўз, Броціган, Кізі... Калі я сутыкнулася з ёй "жыўцом", здзіўлена зразумела, што культура гэтая — вельмі маладая. У нейкім сэнсе — падлеткавая (адносна астатняга свету). Я шчыра абражаюся, калі еўрацэнтрычныя мае сябры-турысты кажуць, што ў ЗША няма мастацтва. І замест таго, каб глядзець на Хопера, Уаета і Калдэра ў Музеі амерыканскага мастацтва Уітні, ідуць вывучаць Пікаса, Ротка і Шагала ў звыклы Музей сучаснага мастацтва МоМа ці "нацяганыя" з Еўропы палотны вялікіх майстроў у Метрапалітэн-музеі.

Паколькі ў ЗША я вучылася ў школе сучаснага мастацтва, то была прыемна ўражаная тым, што адбываецца ў амерыканскім contemporary art. Апошнія гады амерыканскае маладое мастацтва вучыцца быць больш сацыяльным, уплывовым. Праблема адносінаў мастацтва і ўлады цяпер стаіць больш востра, а раней мастакі больш разважалі пра капіталізм, спажыванне і маскультуру, і гэта не вельмі адгукалася ў маім сэрцы.

Яшчэ ў амерыканскім сучасным мастацтве востра паўстаюць пытанні культурнай апрапрыяцыі і экзатызацыі вопыту прыгнечаных народаў і культур, а таксама чужых траўм. Гэта таксама цікава назіраць — напрыклад, нядаўні скандал на біенале ў музеі Уітні, калі белая мастачка Дана Шутц выставіла работу супраць расізму, перамаляваўшы жахлівае старое газетнае фота лінчаванага чарнаскурага падлетка з Місісіпі ў труне. Былі жудасныя публічныя разборкі ва ўсіх СМІ, бо вырабляць мастацтва не з ўласнага болю (асабліва калі ты белы чалавек) — гэта апрапрыяцыя чужых траўмаў, а не дапамога і прыцягванне ўвагі да несправядлівасці. Вось гэтым рэчам ды іх разуменню мне, канечне, давялося доўга вучыцца — дзе праходзіць мяжа паміж дапамогай і выкарыстаннем, сацыяльным мастацтвам ды крадзяжом чужога траўматычнага досведу.

Амерыканцы вельмі чуллівыя да траўмаў, гэта суцэльна псіхааналітычная нацыя, як мне падаецца. Адчуванне віны і сорому, а таксама неабходнасць іх прагаворвання — моцная і цікавая штука. І гэта мне ў амерыканскай культуры падабаецца — адвага, незалежнасць і смеласць разважаць услых пра непрыемнае.

— Ты згадала некаторых пісьменнікаў...

— Што чытае Амерыка? За ўсю ЗША сказаць складана, але ў тых колах, дзе я бываю, папулярны нон-фікшн (для нашага чытача гэта даволі нязвыкла). Атрыманне "Нобеля" Святланай Алексіевіч яшчэ больш умацавала літаратурную актуальнасць гэтага жанру. Таксама актуальны так званы creative non-fiction: сплаў мастацкай і дакументальнай ці аўтабіяграфічнай літаратуры. Напрыклад, такія пісьменніцы, як Крыс Краўс і Мэгі Нэльсан, паэтка Айлін Майлс. Думаю, вельмі цікавіць амерыканцаў перакладная літаратура (Джон Кутзээ, Кларысі Ліспектар, Элена Ферантэ) і творы, напісаныя білінгвістычнымі прадстаўнікамі дзвюх культур і здатныя дапамагчы да гэтых культур наблізіцца — скажам, новая кніжка Марыі Гесэн. Усім цікава, што там у Расіі адбываецца.

Асабіста я не лічу, быццам магу сказаць пра Амерыку штосьці большае за тых, хто гэта зрабіў за мяне (і зрабіў нашмат лепш!). Ды і чытаць зацемкі кшталту "зараз мы вам распавядзём, як усё насамрэч тут у Амерыцы" мне нудна і чамусьці сорамна, далучацца да гэтага хору не вельмі хочацца. Знаходжанне тут дапамагло мне з новымі ідэямі — я скончыла трэці зборнік апавяданняў (некаторыя ўжо надрукаваныя ў расійскіх літаратурных часопісах), ён будзе пра дэпрывацыю мовы, каханне і метэмпсіхоз.

Хаця, канечне, Амерыка там прысутнічае — у адным апавяданні герой прылятае ў Нью-Ёрк начным рэйсам і даведваецца, што на гэтым рэйсе яго... не было, і што прэзідэнтам абралі Трампа, хаця ў ягонай рэчаіснасці прэзідэнтам была Хілары Клінтан. Яшчэ адно называецца "Той, хто сумуе на Блікер-стрыт", і там напісана пра самы маленькі трохкутны сквер у Нью-Ёрку.

Цяпер аб амерыканскай журналістыцы, так? Яна, як і ва ўсім свеце, таксама перажывае крызіс і шукае новыя спосабы данясення якасных гісторый пры неабходнасці неяк зарабіць грошы. Незалежныя маладзёжныя СМІ тут спыняюць існаванне, калі ўладальнік бізнесу, бязлітасны капіталіст, вырашае "зачыніць лавачку". Але ўсё ж такі я бачу розніцу — у ЗША існуе большы давер журналісцкім даследаванням і "лонгрыдам", таму і апошніх больш, і людзі іх чытаюць. А ў нас калі матэрыял перавышае паўстаронкі, рэдактар можа сказаць: не, публіка такі вялікі тэкст чытаць не будзе, ёй лянота. Але тут нікому не лянота, людзі чытаюць журналісцкія гісторыі, гэта ж сапраўдны нон-фікшн (які потым часта і ператвараецца ў кнігу)! Можа, чытацкая культура там больш развітая, не ведаю. Нават у метро ўсе чытаюць кніжкі. У Беларусі я такога не бачыла.

— З выхадцамі з Беларусі маеш зносіны?

— Сябрую з Настассяй Верцель, вельмі таленавітай спявачкай-сонграйтарам з Мінска. Яна жыве тут болей за пяць гадоў, часам дае канцэрты, запісвае другі альбом — першы яе рэліз Out of Time беларускія крытыкі параўноўвалі з Рэгінай Спектар, хаця, на маю думку, яе песні больш блізкія да Bat for Lashes, змрочныя такія. Яшчэ вучылася разам з Настассяй Колас, дачкой перакладчыка і выдаўца Зміцера Коласа — яна эміграваала ў 1998-м, паспела зрабіць кар'еру ў фэшн-індустрыі, а потым перакваліфікавалася ў мастачку, робіць інсталяцыі. У Нью-Ёрку, канешне, выставіцца больш складана, чым у Мінску, але і працэс барацьбы за прастору і бязлітасную куратарскую ўвагу больш цікавы.

...І НЕ ЗАБЫЦЦА ПРА РАДЗІМУ

— На каго-небудзь з тых нашых артыстаў, хто прыязджаў у Штаты з канцэртамі, хадзіла?

— У межах нейкага ўяўнага арт-праекта "Заміроўская пераасэнсоўвае творчасць землякоў у адрыве ад зямелькі роднай" хадзіла на канцэрты трох знакавых беларускіх музыкантаў — Вольскага, Вайцюшкевіча, Міхалка. Было выдатна: шмат настальгіі, цікавая публіка (назіраць за тым, як настальгуюць іншыя, больш цікава, чым фіксаваць уласныя эмоцыі). Адчула, што жудасна сумавала па іх. Першая рэакцыя была — кінуцца на шыю і заліцца слязамі. Амаль і зрабіла гэта ва ўсіх трох выпадках. Спадзяюся, музыканты не спужаліся.

— Сочыш за падзеямі свету беларускай культуры?

— Сачу за гэтым так уважліва, што сябры нават смяюцца з мяне. І не толькі сябры. Памятаю, як Валера Краснагір, рэдактар Filet Magazine, напісаў у фэйсбуку штосьці кшталту: як можна жыць у Брукліне і слухаць "Петлю Пристрастия" і Brutto! Але так, можна. Больш за тое, калі ты проста вольны слухач і не жывеш у Беларусі, можаш быць упэўненым: калі табе падабаецца "Петля Пристрастия" — гэта, мабыць, таму, што яны аб'ектыўна крутыя.

Мне падабаецца, што ў Беларусі апошнім часам з'яўляецца столькі выдатных індзі-праектаў — Super Besse, Mustelide, Shuma. Таксама радуюць моцныя праекты памяці, кшталту "(Не)Расстралянай паэзіі". А што не падабаецца, дык гэта амаль поўная адсутнасць музычнай ды арт-аналітыкі — у нас у краіне яе практычна няма або вельмі мала (ну вось газета "Культура" ёсць, і, хаця я не схільная рабіць рэверансы, адзначу, што гэта сапраўды часам адзінае месца, дзе можна пачытаць рэпартажы пра імпрэзы, якія адбыліся). Анонсы і фоткі — вось і ўвесь фармат арт-рэпартажу беларускіх гарадскіх СМІ.

— Ці ёсць планы на вяртанне ў Мінск?

— У Нью-Ёрку немагчыма будаваць планы! Усё, што са мной адбываецца апошнія тры гады, запланавана не было.

К

Даведка

Таццяна ЗАМІРОЎСКАЯ, нарадзілася ў Барысаве. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Вышэйшую школу мастацтваў імя Мілтана Эйвэры пры Bard College (Нью-Ёрк). Друкавалася ў беларускіх, украінскіх і расійскіх СМІ. Аўтар двух зборнікаў апавяданняў: "Жыцце без шуму і болю" і "Вераб'іная рака". Журналістка, пісьменніца, арт-крытык.

Парасткі будучыні

Топ-5 новых музеяў 2017 года

Паводле дадзеных ICOM, у 202 краінах свету ў наш час існуе 55 тысяч музеяў. І кожны год іх колькасць павялічваецца ў геаметрычнай прагрэсіі. На розных рэгіянальных, нацыянальных і сусветных форумах прадстаўнікі музейнай супольнасці працягваюць абмяркоўваць розныя мадэлі ўстаноў будучыні. Прэваліруе разуменне музея не як інстытуцыі, якая абцяжарвае нацыянальную эканоміку, але як лакаматыва культурнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця.
Парасткі будучыні можна ўбачыць у сённяшніх наватарскіх праектах, аўтары якіх спрабуюць пашырыць паняцце "музейная архітэктура", зразумець запыты наведвальніка, выкарыстаць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Нарэшце, стаць арганічнай часткай сучаснага жыцця, а не толькі захавальнікам мінулага.

1. МУЗЕЙ ЭКСПА (КНР)

У лістападзе 2010 года Міжнароднае бюро выстаў са штаб-кватэрай у Парыжы прыняла рашэнне, прызнанае гістарычным, — аб стварэнні ў **Шанхаі першага ў свеце музея, прысвечанага Сусветным выставам**. 1 мая 2017 года ён адчыніў дзверы ў кітайскім мегаполісе, адразу прыцягнуўшы ўвагу сваімі экспанатамі, якія ўвасабляюць усё багацце навукова-тэхнічных і культурных дасягненняў сусветнай супольнасці. Музейны комплекс размяшчаецца ў гарадскім раёне Пусі — на тым самым месцы, дзе сем гадоў таму стартавала ЭКСПА "Шанхай-2010".

Стварэнне музея стала вынікам сумесных намаганняў урада горада і Міжнароднага бюро выстаў. Канцэптуальна ён разумеецца як "база ведаў пра культуру ЭКСПА і звязаныя з сусветнымі выставамі інавацыі". Стацыянарная экспазіцыя музейнага комплексу складаецца з 8 залаў агульнай плошчай 9000 квадратных метраў, дзе кожная прысвечана асобнай тэме. У напаўненні залаў удзельнічалі 28 навуковых і грамадскіх інстытуцый з 12 краін. Акрамя стацыянарнай экспазіцыі, наведвальнікам прапануецца тры выставачныя павільёны агульнай плошчай 3 тысячы квадратных метраў. Навуковае і мастацкае праектаванне экспазіцыі выканала міжнародная каманда з кітайскіх, іспанскіх і італьянскіх спецыялістаў. Пра інтэрнацыянальны характар музея сведчыць той факт, што ўсе культурна-адукацыйныя паслугі ў ім дубліруюцца ў поўным аб'ёме на англійскай мове.

2. ЛУЎР У АБУ-ДАБІ (ААЭ)

11 лістапада 2017 года адбылося адкрыццё музея на востраве Саадыят, будаўніцтва якога пачалося ў 2009 годзе. Агульная плошча перавышае 24 тысячы квадратных метраў, каштарыс складае, паводле розных ацэнак, 83 — 107 мільёнаў еўра. Архітэктар Жан Нувель запраектаваў шкляны дах дыяметрам 180 метраў, а таксама ўнутраныя водныя каналы, што стварае ілюзію знаходжання наведвальніка пад адкрытым небам і адначасова ў адкрытым моры.

У экспазіцыі можна будзе ўбачыць 300 твораў мастацтва розных эпох і цывілізацый, у тым ліку такія шэдэўры, як "Цудоўная Феранцера" Леанарда да Вінчы, "Напалеон на перавале Сэн-Бернар" Жака-Луі Давіда, "Аўтапартрэт" Ван Гога, "Вакзал Сэн Лазар" Клода Манэ, карціны Пікаса, Гагена, Магрыта. Гэтыя творы былі арандаваныя ў Луўры, Музеі Арсэ, Музеі Гімэ, Версалі, Фантэнбло, Цэнтры Жоржа Пампіду за плату, якая складзе каля 750 мільёнаў еўра. Яшчэ паўмільёна еўра Абу-Дабі абышлося права выкарыстоўваць у назве свайго музея слова "Луўр", а таксама дапамога французскіх кіраўнічых структур на чале з дырэктарам Мануэлем Рабатэ. Штогод парыжане будуць праводзіць у Абу-Дабі па чатыры мастацкія выставы. У адваротны бок, адпаведна дамоўленасці, пойдуць сур'ёзныя інвестыцыі ў французскую энергетыку, транспарт, ядзерныя, касмічныя і авіяцыйныя тэхналогіі.

Апошнім часам праект "Луўр у Абу-Дабі" моцна крытыкавала французская экспертная супольнасць за яго відавочна камерцыйны характар, а таксама за даступнасць экспазіцый пераважна мясцовай і міжнароднай эліце. Тым не менш, востраў Саадыят неўзабаве стане сапраўды "музейным", бо акрамя "Луўра ў Абу-Дабі", на ім размесцяцца філіял Музея Саламона Гугенхайма і Нацыянальны гістарычны музей шэйха Саіда.

3. МУЗЕЙ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ПОЛЬШЧА)

Яго адкрыццё адбылося 23 сакавіка 2017 года ў Гданьску. Ідэя стварэння музея, які б у сваёй экспазіцыі распавядаў пра падзеі Другой сусветнай у глабальным маштабе, належала тагачаснаму прэм'ер-міністру Польшчы Дональду Туску. У 2007 годзе яна ўвасобілася ў адпаведнае рашэнне ўраду краіны, які выдзеліў на яе рэалізацыю 115 мільёнаў еўра. Тады ж арггрупа па стварэнні музея пад кіраўніцтвам прафесара Паўла Махцэвіча распачала камплектаванне яго фондавага збору ў розных краінах — удзельніцах вайны. У 2012 годзе па праекце Яцэка Доршча пачалося ўзвядзенне музейнага будынка, галоўная частка якога знаходзіцца пад зямлёй. Драматычнае мінулае ўвасабляецца з дапамогай дзвюх з паловай тысяч экспанатаў і 250 мультымедыйных аб'ектаў, размешчаных на плошчы 5 тысяч квадратных метраў. Сучаснасць, паводле задумы архітэктара, павінна сімвалізаваць прылеглая да будынку тэрыторыя. А будучыню — вежа, якая прызначана для культурна-адукацыйнай дзейнасці.

У 2015 годзе, калі будынак музея ўжо быў скончаны і адбываўся працэс мантажу экспазіцыі, да ўлады ў краіне прыйшла правая партыя "Права і справядлівасць". Яе кіраўніцтву не спадабалася ліберальна-касмапалітычная канцэпцыя экспазіцыі музея, а таксама бесстаронні аповед пра вайну і ўцягнутыя ў яе народы. Неўзабаве прагучалі патрабаванні адкарэктаваць канцэпцыю музея, але яго дырэкцыя разам з міжнароднай Вучонай радай адстойвалі ўласную пазіцыю. У выніку некалькіх судовых разбіральніцтваў Музей Другой сусветнай вайны аб'яднаў з іншай гданьскай музейнай установай — Музеем Вестэрплятэ, які распавядае менавіта пра гераізм польскіх салдат.

4. МУЗЕЙ СУЧАСНАГА МАСТАЦТВА (ПАР)

Урачыстасці з нагоды адкрыцця найбуйнейшага на афрыканскім кантыненце Музея сучаснага мастацтва (MOCAA) адбыліся 6 кастрычніка ў найпрыгожым і найпапулярным сярод турыстаў горадзе Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі — Кейптаўне. Падмурак фондавага збору музея склала прыватная калекцыя афрыканскага мастацтва вядомага нямецкага бізнесмена Ёхана Цайца. Паўднёваафрыканская інвестыцыйная карпарацыя перадала пад музей будынак былога элеватара ў гістарычнай частцы горада. Конкурс на яго рэканструкцыю і пераўтварэнне ў музей выйграў англійскі архітэктар і дызайнер Томас Хезэрвік.

Адпаведна праекту, на сямі з дзевяці паверхаў будынка агульнай плошчай 9,5 тысяч квадратных метраў у бліжэйшы час будзе разгорнутая стацыянарная экспазіцыя плошчай у 6 тысяч квадратных метраў. Паводле слоў дырэктара музея Марка Куцзье, яна спраектаваная такім чынам, каб стварыць панараму сучаснага мастацтва на ўсім афрыканскім кантыненце. Карціны, скульптуры, інсталяцыі размесцяцца ў адкрытай, асветленай праз шкляны дах прасторы белага колеру. Арганічнай яе часткай будуць восем бетонных труб былога элеватара, які Хезэрвік лічыць помнікам індустрыяльнай архітэктуры. Акрамя экспазіцыйных залаў, а таксама памяшкання пад фондасховішча, маецца рэкрэацыйная зона з кіназалай, бібліятэкай, а таксама рэстаранам на даху будынка, адкуль адкрываецца маляўнічы від на кейптаўнскую бухту. У Музея сучаснага мастацтва ёсць філіял "Сэгера" ў Кеніі, дзе, акрамя экспазіцыі твораў афрыканскага мастацтва, працуе рэзідэнцыя для маладых мастакоў.

5. МУЗЕЙ АМЕРЫКАНСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ (ЗША)

Ці не самым "гістарычным" горадам ЗША з'яўляецца першая сталіца краіны Філадэльфія. Тут у 1776 годзе была прынята Дэкларацыя незалежнасці, а ў 1787 годзе ўхвалены тэкст дзейнай Канстытуцыі ЗША. І вось, 19 красавіка 2017 года там адкрыўся Музей рэвалюцыі. Дзень быў абраны невыпадкова. Менавіта 19 красавіка 1775 года адбылася першая важная падзея Вайны за незалежнасць, а менавіта бітва паміж паўстанцамі і англічанамі пры Лексінгтане.

Для музея быў узведзены спецыяльны трохпавярховы будынак агульнай плошчай у 50 тысяч квадратных метраў, які ўжо стаў аб'ектам крытыкі. Аснову фондавага збору новага музея склалі калекцыі мясцовага гістарычнага таварыства, якія назапашваліся цягам усяго XX стагоддзя.

Першыя наведвальнікі ўбачылі стацыянарную экспазіцыю, спраектаваную паводле тэматыка-храналагічнага прынцыпу з відавочнымі элементамі тэатралізацыі. Найбольшую цікавасць выклікаюць такія экспанаты, як бостанскае дрэва свабоды, паходны намёт Джорджа Вашынгтона, сцяг галоўнакамандуючага войска паўстанцаў. Стваральнікі экспазіцыі ўзнялі шэраг малавывучаных пытанняў гісторыі амерыканскай рэвалюцыі — напрыклад, удзел у ёй жанчын, афраамерыканцаў, індзейцаў.

Як мяркуецца, музей штогадова будзе прымаць паўмільёна наведвальнікаў. Акрамя стацыянарнай экспазіцыі, ім прапануецца наведаць выставачную залу, музейны тэатр, а таксама ўнутраны двор з садам скульптур і кавярняй. Па словах прэзідэнта музея Майкла Квіна, яго стварэнне абышлося ў 150 мільёнаў долараў, прычым большую частку гэтай сумы склалі прыватныя ахвяраванні амерыканцаў.

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,
доктар гістарычных навук, прафесар

Віктар Грамыка. Аўтапартрэт.

Я перакананы, што гэты чалавек — асоба ўнікальная. Шчыры патрыёт зямлі беларускай — без дэманстрацыі напаказ; мужны партызан Вялікай Айчыннай; бліскучы жывапісец і педагог-прафесар, з-пад крыла якога выйшлі некалькі пакаленняў творцаў; суразмоўца, з якім можна гаварыць бясконца не толькі ўласна пра "справу жыцця" — выяўленчую культуру, а і наогул пра "філасофію быцця": ад таямніц космасу да сутнасці ваеннай прозы Васіля Быкава, партрэт якога мастак калісьці намаляваў з натуры. А яшчэ ён здольны мемуарыст і сумленная ды прынцыповая асоба з моцным маральным стрыжнем. Не буду інтрыгаваць чытача: гэты чалавек — народны мастак краіны Віктар Аляксандравіч ГРАМЫКА, якому 2 студзеня 2018 года спаўняецца 95!

"Убачыць Зямлю ўсю"



Віктар Грамыка. "Зямля".

ДАВЕР ДА ГЛЕДАЧА

Жывапісец яркай метафарычнасці і складанай алегарычнасці, у сваіх лепшых фігуратыўных карцінах і панарамных пейзажах ён заўсёды імкнецца да шматпланавага змястоўнага падтэксту. А падтэкст, больш дакладна — дэвіз, у яго адзіны ў сваім родзе — "Убачыць Зямлю ўсю", які можна з поўным правам аднесці цалкам да мастацтва Віктара Аляксандравіча. Бо гэтая Зямля з вялікай літары — галоўная і асноватворная тэма яго мастакоўскага жыцця: зямля, абпаленая агнём вайны і палітая крывёю; зямля, абноўленая пасля Перамогі; зямля і на ёй — чалавек, цудоўны ў сваёй існасці і дабрыні.

Канешне ж, Віктар Грамыка перш за ўсё — пясняр подзвігу чалавека на вайне. І гэты подзвіг ён бліскуча адлюстраваў не толькі ў сімволіка-алегарычных шматфігурных палотнах, але і ў "карцінных" пейзажах-сімфоніях, якія ён вар'іраваў у розных эмацыйных ключах. Яны звязаныя з памяццю пра пражытае і прачулае ў мінулай вайне, бо нялёгкае партызанскае юнацтва — заўсёды ў ягоным сэрцы. І плынь гадоў гэтае пачуццё не сцірае, а часам нават абвастрае, і тады рука міжволі цягнецца да пэндзля або да пісьменніцкага пяра (згадаем яго цікавую кнігу ўспамінаў "Вясёлка над дарогай"!).

Віктар Грамыка — рэаліст-рамантык, які выпрацаваў гераічны, узвышаны лад мыслення, дзе жыццёвая праўда неаддзельная ад мары, а эпас — ад пранізлівай лірыкі. Партызанская маладосць падарыла мастаку такую магчымасць — і сама атрымала ў ягоных творах сваё высокаэстэтычнае ўвасабленне. Таму работы гэтыя заўсёды сучасныя: ад знакамітых палотнаў "Салдаты", "Песня пра мой атрад", "Яблыкі ўраджаю 1941 года", "Успамін пра нарачанскую пераправу", "Разведчыкам майго палка прысвячаю" — да эпічных пейзажных карцін "Над старымі акопамі — цішыня", "І неба над намі", "Зямля", "Зямля беларуская", "Дарогі залатой восені", "Вясёлка над храмам"... Сучаснасць гэтая — у іх адкрытасці, у даверы мастака да гледача, у майстэрстве зрабіць яго даверaным сваіх пачуццяў. У гэтым заключаецца вялікае прынцыповае значэнне і каштоўнасць творчасці Майстра.

Я добра ведаю Віктара Аляксандравіча, амаль дзесяць гадоў працаваў з ім у апараце Саюза мастакоў БССР (а ён двойчы ўзначальваў гэтую творчую арганізацыю), часта сустракаўся з мастаком у яго майстэрні і на кватэры ў нашым "сурганаўскім" доме, разам мы рыхтавалі матэрыялы да розных мастацкіх пленумаў і з'ездаў. Таму мне ёсць што расказаць пра яго.

ПАМЯЦЬ, ГЛЫБОКАЯ ЯК КАЛОДЗЕЖ

Якія б мы праблемы ні закраналі, тэма мінулай вайны заўсёды выходзіла ў нашых гутарках на першы план. І гэта зразумела. Вось яго поўны паслужны спіс баявой дзейнасці ў час Вялікай Айчыннай: член падпольнай групы антыфашысцкага супраціўлення ў Оршы, разведчык аднаго з атрадаў брыгады "Дзядзі Косці" — Канстанціна Заслонава, кулямётчык, камісар 13-га атрада Смаленскага палка асобага прызначэння, адказны сакратар партызанскай газеты "Народны мсцівец".

У 1967 годзе Грамыка прадставіў гледачу карціну "Салдаты". Пасля яго дыпломнай работы ў БДТМІ "Дарога мсціўцаў" гэта была другая кампазіцыя пра мінулую вайну. Тры таварышы-ветэраны — быццам жывы помнік, падножжам якому служыць сферычная зямля — стаяць на ўзгорку на фоне велізарнага, на ўсё палатно, ружаватага неба з белаватымі аблокамі. Двое — з гранёнымі шклянкамі, трэці — з алюмініевай конаўкай. У глыбокім маўчанні кожны ўспамінае палеглых аднапалчан на той самай палітай крывёю зямлі, дзе яны калісьці змагаліся з ворагам. Урачыстая трызна ўчарашніх салдат, чалавечных і чыстых сэрцам. Хвалюючая мізансцэна...

Аднак колькі было спрэчак і дыскусій вакол гэтага палатна! Мастака безапеляцыйна абвінавацілі ў "агрубленні рэчаіснасці" і ледзь не ў прапагандзе...



Віктар Грамыка. "Салдаты".

алкагалізму. Які, маўляў, прыклад для моладзі? З пазіцыі "причесанности", якой надзяляліся многія тагачасныя сусальныя карціны з ваеннымі сюжэтамі, падобныя папрокі былі прывычна зразумелыя. Але штабелі прыкра-парадных пастаралей пра вайну, якіх у тыя часы было вельмі шмат, даўно адышлі ў нябыт, а палатно "Салдаты" і па сёння засталося пранізліва-глыбокай "насечкай" у выяўленчай культуры Беларусі.

"А памяць, як калодзеж, глыбокая..." Гэта радок песні Уладзіміра Высоцкага. Так, усё далей ад нас вайна. Хутка адзначым 73 гады з дня яе заканчэння. Але вось з часам яна нібы пачынае набліжацца да нас, успамінаецца ўсё часцей і ўсё больш пранізліва менавіта ў першыя дні мая, калі апошнія ветэраны падымаюць келіхі за Перамогу нашу вялікую. Сярод іх, ацалелых у жорсткіх баях, і Віктар Грамыка — пясняр партызанскіх подзвігаў і драм — і яго равеснік, былы салдат Вялікай Айчыннай Леанід Шчамялёў, які ў лютым 2018-га таксама адзначыць свой 95-ты юбілей.

І тут не адняць, не дадаць. Бо менавіта чысты парыў любові да сваёй Бацькаўшчыны — і ў аднаго, і ў другога — быў тым самым унутраным компасам, які прывёў іх ад цяжкіх ваенных нягодаў да святла Яго Вялікасці Мастацтва. Верагодна, быў у іх свой анёл-ахоўнік, які збярог абодвух для нашай культуры, для сям'і, для радзімы...

Дык вось, мінулае мастака Грамыкі, яго баявая партызанская маладосць, незагойныя раны вайны — не проста ўспаміны. Гэта нібы люстэрка яго сённяшніх думак і перажыванняў. "Крывыя люстэркі" непрымальныя для яго характару.

БОЛЬ І МУЖНАСЦЬ

Для Грамыкі гісторыя ніколі не была аддзелена ад рэальнага жыцця. Не патэтычная гераізацыя, не подзвіг як канкрэтны ўчынак, але здольнасць чалавека перад абліччам выпрабаванняў раскрыць сваю сапраўдную сутнасць — вось тое, што накіроўвала аўтара да асэнсавання вобразаў. А ў іх зліваліся разам і боль, і беды, і мужнасць, і цяжар вайны. У сваёй выспаведанай творчасці ён пастаянна вяртаўся не да канстатацыі факта, а да яго асэнсавання-сімвалізацыі, пераводу з канкрэтнага вымярэння ва ўніверсальнае і заўсёды існае.

Партызанская тэма стала тым зборным вобразам, у якім мастак бачыў перш за ўсё свабодны, непераможны, незламаны дух. Уласная памяць вяртала да таго святога і незабыўнага, што перажыў сам мастак у пачатку вайны, потым у Аршанскім падполлі і ў партызанскіх лясах Віцебшчыны.

Праз гады ён увасобіў гэтыя ўспаміны ў карціне, якая стала адной з найлепшых у яго творчасці, — "1941 год. Над Прыпяццю". Вось што сказаў пра яе Міхаіл Савіцкі, таксама ветэран вайны і сябра мастака: "Я веру, нашчадкі нашы, як і сучасная моладзь, запаволяць крок перад вобразам палеглага ў баі воіна-памежніка, вобразам сімвалічна ёмістым і ў той самы час гістарычна канкрэтным; перад вобразам акамянелай у смутку жанчыны на прыпяцкім пяску; пачуюць той голас дзяўчынкі, што выбухае па-над цёмнай ракой, клічучы перавоз, які і праз гады, дзесяцігоддзі стаіць у вушах. Нашчадкі схіляць галовы перад высокай самаадданасцю ўсіх жанчын, для якіх абарона Айчыны была сэнсам жыцця". Лепш і не скажаш...

Віктар Грамыка дасягнуў уражвальных мастацкіх вяршынь і ў сваіх пейзажах, у якіх ён прыйшоў да своеасаблівай "сімфанічнай манументальнасці", не губляючы пры гэтым лірычнай чысціні аголеных чалавечых пачуццяў. У выніку складваецца новы аўтарскі выяўленчы свет, які не толькі строга суаднесены з рэальнасцю, але і надзелены сваімі ўнутранымі вобразна-пластычнымі законамі. Яны дапускаюць шырокае і свабоднае пераасэнсаванне натуры. Невыпадкова такія пранізлівыя пейзажна-карцінныя палотны, як "Ільны беларускія", "Глубелька — сэрца блакітных азёр Беларусі" ці "Чырвоныя землі Полаччыны", назаўсёды ўвайшлі ў залаты фонд айчыннага жывапісу.

Квінтэсенцыя мастакоўскага і грамадзянскага крэда — у шматпланавай творчасці Віктара Грамыкі. Гэта знакавая з'ява ў беларускай нацыянальнай культуры, адкрытая кніга гуманізму і вечных чалавечых каштоўнасцяў. І сапраўдная народнасць народнага мастака...

Барыс КРЭПАК

Рэдакцыя "К" зычыць Віктару Аляксандравічу перш за ўсё добрага здароўя і святочнага настрою ў юбілейныя дні!

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:

- Выставачны праект **"Святыя непадзеленай Царквы"** — да 20 лютага 2018-га.
- Выстава **"Валерый Шкаруба. Жывапіс"** — да 21 студзеня 2018-га.
- Выстава **"Сімфонія жыцця"** (да 70-годдзя жывапісца і графіка Мікалая Таранды) — да 7 студзеня 2018-га.
- Выстава Алега Карповіча **"Партрэт і сяброўскі шарж"** — да 19 студзеня 2018-га.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстава моды і аксесуараў эпохі Рамантызму з калекцыі Ігара Сурмачэўскага **"І паланэз пачаць пара"** — да 13 студзеня 2018-га.
- Выстава акварэлі Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай **"Мы любім кветкі..."**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Жаночы сусвет"** — да 11 сакавіка 2018-га.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:

- Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
- Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
- Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Выставы:

- Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
- Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
- Выстава **"Кракаўскія калядныя батлейкі"** — да 14 студзеня 2018-га.
- Выстава **"Моднае стагоддзе"** — да 10 студзеня 2018-га.
- Святочная праграма да Новага года.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

- **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
- Экспазіцыйны праект **"Мінск 1917"**, прысвечаны гісторыі горада ў рэвалюцыйны 1917 год — да 14 студзеня 2018-га.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.

- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.

Экспазіцыі:

- "Геалогія і палеанталогія".
- "Сезонныя змены".
- "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
- "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
- "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
- "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
- Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага 2018-га.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

- Выстава **"Сафары парк"**.
- Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
- Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
- Выстава дзіцячай творчасці **"Калядныя замалёўкі — 2017"** — да 21 студзеня 2018-га.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Старая, старая кухня"** — да 7 студзеня 2018-га.

Майстар-класы:

- Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
- Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"

- **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
- **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
- **Праспект Незалежнасці, 44.**
- **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"

- **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
- **Праспект Пераможцаў, 5.**
- **Вуліца Рабкораўская, 17.**
- **Праспект Незалежнасці,168, В.**
- **Вуліца Лабанка, 2.**

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Персанальная выстава **"Усяго?!."** Тацяны Жыткоўскай, кінарэжысёра і мастака–пастаноўшчыка Студыі анімацыйных фільмаў "Нацыянальнай кінастудыі" "Беларусьфільм" — да 14 студзеня 2018-га.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Часовая экспазіцыя **"У баях за Айчыну. Дзейнасць спецгруп НКУС-НКДБ СССР-БССР на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941 — 1944 гг."** — да 31 студзеня 2018-га.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава абрэзкавай мазаікі Маргарыты Котавай **"Нясвіж. Бег стагоддзяў"** — да 14 студзеня 2018-га.
- Выстава **"Гарнітурная лялька і кабінетная бронзавая скульптура"** з калекцыі Мікалая і Алены Байрачных — да 4 лютага 2018-га.
- Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.

- Пастаянная экспазіцыя.

Ратуша Вул. Савецкая, 3.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Сімвал незалежнай Беларусі: адраджэнне Мірскага замка"** (да 25-годдзя адкрыцця першай музейнай экспазіцыі)" — да 31 снежня.
- Выстава **"Навагодняя казка ў Мірскім замку"** — да 15 студзеня 2018-га.
- Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Музейныя заняткі.
- Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
- Выстава графікі Настассі Вальс **"Мір жанчыны ў літаратуры: ад Ліліт да Лаліты"**.
- Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
- Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
- Музейныя майстар-класы і заняткі.
- Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
- Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
- Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

Акцыі:

- Святочная праграма для дзяцей **"Да Коласа на Новы год"**.
- **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
- Выстава **"Гарадскія патэрны ў калядныя святы"** — да 14 студзеня 2018-га.
- Выстава дзіцячага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Цуд на Каляды!"** — да 21 студзеня 2018-га.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

- **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
- Выставачна-інтэрактыўны праект **"Сустрэча з майстрам"** — да 31 снежня.
- Выстава жывапісу Сілвы Лінартэ (Латвія) **"Адлюстраванне"** — да 4 лютага 2018-га.
- Выстава **"Аголеная натура"** — да 7 студзеня 2018-га.
- Выстава **"Тры чарапахі"** (з прыватнай калекцыі мінскага архітэктара Любові Нардшэйн) — да 14 студзеня 2018-га.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

- Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.

- **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.

- Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

- Выстава ўдзельнікаў і сяброў фотаклуба "Мінск" **"Справаздача пад Новы год"** — да 14 студзеня 2018-га.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- **"Музей крыміналістыкі"**.
- Выстава **"Гомель і гамяльчане напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны"** (выставачная зала).
- Выстава **"Бітва матараў"** (хол музея).

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:

- **"Прырода Лідчыны"**.
- **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

- Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
- **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
- Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
- Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
- Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
- Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
- Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
- Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
- Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2 68 96.

- Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
- Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
- Выстава **"Гэты дзівосны школьны свет"** (з уласнай калекцыі Івана Буйко).
- Прадстаўленні лялечнага тэатра **"Батлейка"**.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.

- Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.

г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.

- Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ

г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).

- Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
- Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

- Выстава-прэзентацыя **"Таямніцы ілюстраванай старонкі"** — да 6 студзеня 2018-га.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

- **30, 31 снежня — "Шчаўкунок, або Яшчэ адна калядная гісторыя"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага (з удзелам артыстаў балета Вялікага тэатра Беларусі і навучэнцаў харэаграфічнай гімназіі-каледжа). Пачатак а 12-й (субота) і аб 11-й (нядзеля).
- **30, 31 — Гала-канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі.** Пачатак а 19-й (субота) і а 18-й (нядзеля).
- **2 студзеня — "Тры парсючкі"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Пачатак а 12-й.
- **2 — "Яўген Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
- **3, 4, 5, 6 — "Шчаўкунок..."** Пачатак а 12-й.
- **3, 4 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
- **5 — "Баль-маскарад"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі.
- **6 — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

- **30 снежня — "Цуды пад Новы год"** (інтэрактыўнае прадстаўленне). Пачатак а 12-й і а 17-й.
- **3 студзеня — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак аб 11-й.
- **4 — "А мне не сорамна!.."** (больш чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
- **5 — "Пакуты ад здаровага сэнсу"** (камічная прыпавесць) С.Рубэ. Прэм'ера.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

- **30 снежня — "Лятучы карабель"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) М.Дунаеўскага. Прэм'ера. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
- **30 — "Лятучая мыш"** (аперэта ў 3-х дзеях) І.Штрауса.
- **31 — "Усё лепшае"** (шоу-канцэрт пад Новы год). Пачатак а 18-й.
- **2, 3 студзеня — "Баль у Папялушкі"** (навагодні шоу-канцэрт для дзяцей і дарослых) Пачатак аб 11-й і а 14-й.
- **3 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава.
- **4 — "Джунглі. Новы год"** (музычная казка для дзяцей). Прэм'ера. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
- **4 — "Баль у "Савоі"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
- **5, 6 — "Лятучы карабель".** Пачатак аб 11-й і а 14-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **"З Новым годам, добры Гном!"** (казка на 1 дзею). Пачатак **30 снежня** — у 10.30 і 13.30; **2, 3, 4 студзеня** — а 17-й; **6 студзеня** — аб 11-й і а 14-й.

УВАГА!

ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!

Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by